Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 282 (5118) СНЕЖНЯ 17 ПАНЯДЗЕЛАК 1934 г. год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ВЫПУСК АЛЮМІНІЯ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА У ТРЫ РАЗЫ

МАСКВА, 16 снежня (БЕЛТА). Самая маладая і складаная галіна нашай соцыялістычнай індустрыі — совецкая алюміневая прамысловасць — **датэрмінова выканала гадавы план** выплаўкі металічнага алюмінія. Заводы плавяць цяпер алюміній у фонд імя XVII з'езда совецтаў, да канца года яны дадуць звыш плана больш тысячы тон металічнага алюмінія. У параўнанні з мінулым годам выпуск совецкага алюмінія ў гэтым годзе павялічваецца больш чым у тры разы. Значна палепшыліся таксама і якасныя показчыкі работы.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ МАГІЛЕЎСКАГА РАЕНА— ПЕРШАЯ Ў БССР ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПРОМФІНПЛАН

Тэлеграф прынёс радасную вестку — **магілеўская прамысловасць** у цэлым першай па БССР выканала гадавы промфінплан.

Гэта вестка быстра разыйсецца па прадпрыемствах Беларусі, выклікаючы яшчэ больш энтузіязму ў барацьбе за выкананне плана па ўсёй прамысловасці.

Быстра расце спіс перадавых прадпрыемстваў. Да спісу асобных фабрык і заводаў дадаюцца раёны і першым з іх **Магілеўскі**, галіны прамысловасці і першымі з іх — **Белкімо, мукамольная, Лесдрэўхімсаюз, Белэнергатрэст.**

Ці можа быць яшчэ больш доказ рэальнасці нашых планаў, невычарпальных магчымасцей нашых прадпрыемстваў.

Мы навучыліся і працуем значна лепш, чым працавалі раней. Гісторыя Совецкай Беларусі яшчэ не ведае такога вышэйшку, каб цэлыя галіны, цэлыя гарады выконвалі на два тыдні раней план.

Перамога, атрыманая пролетарыямі Магілева, не прышла сама. Пасяховае выкананне плана радам фабрык і заводаў Беларусі— не выпадковае з'явішча. Гэта адно з слагаемых з сумы перамог, заваяваных нашай рэспублікай пад дапамозе і кіраўніцтве ЦК ВКП(б) і правадыра нашай партыі таварыша **Сталіна.** Яны з'яўляюцца рэзультатам таго, што ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало настойна мабілізаваў пастаргані-зацыю на выкананне задач, пастаўленых ЦК ВКП(б) і т. Сталіным.

Гэтыя перамогі, упершыню заваяваны нашай прамысловасцю, гавораць аб тым, што мы можам працаваць добра, што ў нас ёсць усе ўмовы к таму, каб выканаць гадавы план па ўсёй прамысловасці ў цэлым і кожным прадпрыемствам у паасобку.

Значыць, няма ніякага апраўдання адставанню раду прадпрыемстваў Беларусі. Значыць, корань адставання тоіцца ў няўменні арганізаваць, вытворчасць, у адсутнасці ўнутрызаводскага планавання, безгаспадарчасці.

Менскі завод імя Варашылава адным з першых выканаў гадавы план. Завод паказаў, што ён можа працаваць па-большэвіцку. Ён паказаў бліскучы прыклад астатнім прадпрыемствам.

Але ці значыць гэта, што завод працуе выключна добра? Не, такога вываду зрабіць яшчэ нельга. Яшчэ зусім нядаўна на старонках «Звязды» мы паказалі, якія невычапальныя магчымасці тоіцца на заводзе імя Варашылава, а гэта ў значнай ступені і на ўсіх прадпрыемствах.

Мы паказалі лічбамі і фактамі, што пры сапраўднай мабілізацыі ўнутраных рэзерваў заваяваныя дасягненнямі можна падвоіць і патроіць.

Значыць, машэй націск на выкарыстанне **ўнутраных рэзерваў,** за аўладанне **высокай культурай працы,** за прадукцыйную работу **поўных 420 мінут,** за работу прадпрыемства з чоткасцю механізма гадзінніка.

І асабліва зараз трэба пастаўіць перад раённымі і гаспадарчымі арганізацыямі, як баявую задачу — не хавацца за сярэднімі лічбамі выканання плана гарадамі, раёнамі або аб'яднаннямі. **Максімум увагі адстаючым прадпрыемствам, бо яны могуць і абавязаны працаваць не горш за перадавых.**

Прэзідыум ЦСПСБ пастанавіў прасіць ЦВК БССР занесці ў чырвоную кнігу імя XI з'езда совецтаў БССР завод **імя Варашылава, магілеўскую шаўковую фабрыку, завод «Пролетарый», акуляровую фабрыку (Віцебск), завод «Чырвоны металіст», завод імя Менжынскага, запалкавую фабрыку «Пролетарская перамога» і фабрыку «Окцябр».**

Права быць занесенымі ў чырвоную кнігу імя з'езда совецтаў маюць усе прадпрыемствы.

Выраўнаць рады ў калоне прадпрыемстваў Беларусі! Прыйсці да новага гаспадарчага года з поўным выкананнем плана па ўсіх прадпрыемствах Беларусі! Працаваць так, як працуюць пролетарыі Магілева!

БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ ПЕРАДАВІКАМ!

ЦК КП(б)Б — т. т. Гікало, Валковічу,
Соўнарком БССР — т. Галадзеду,
Рэдакцыям газет „Звязда" і „Рабочий"

Ажыццяўляючы ў штодзённай рабоце шасць гістарычных умоў тав. **Сталіна,** пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. **Гікало,** пролетарыі г. Магілева в 15 снежня г.г. выканалі гадавы промфінплан на **100,19** проц., што складае ў цэнасным азначэнні высокакласнай прамысловай прадукцыі на 90.546 тыс. руб.

Гэта перамога дасягнута партарганізацыяй, рабочымі-ўдарнікамі, інжынерна-тэхнічным персаналам Магілева ў рэзультаце мабілізацыі энтузіязма рабочых мас, на аснове рашэнняў **XVII з'езда ВКП(б), XV з'езда КП(б)Б, разгортвання соцыялістычных метадаў працы, соцспаборніцтва і ўдарніцтва і перабудовы ўсёй партмасавай работы згодна ўказанням тав. Сталіна.**

Партарганізацыя пайшла кіравалася ўказаннем тав. **Сталіна,** што **«тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё»** — тэхнічная вучоба, зотаўскі рух, рабочае вынаходства шырока разгарнуліся на прадпрыемствах Магілева. У першых радах барацьбітоў за аўладанне тэхнікай ідуць шаўковая фабрыка і завод імя **Сталіна.**

Перавыбары совецтаў, падрыхтоўка к VII раённаму з'езду совецтаў Магілеўшчыны ішлі пад знакам шырокай арганізацыйнай работы за датэрміновае якаснае і колькаснае выкананне промфінплана: на прадпрыемствах былі арганізаваны брыгады лепшых ударнікаў імя VII усесаюзнага з'езда совецтаў.

Партарганізацыя Магілеўшчыны, рабочыя-ўдарнікі, інжынерна-тэхнічны персанал запэўнялі ЦК КП(б)Б і ўрад БССР, што **1935 год будзе для нас годам замацавання і далейшага разгортвання дасягнутых перамог.** Мы бярэм на сябе абавязацельства дабіцца па кожны завод, кожная фабрыка, кожны цэх, брыгада, рабочы сістэматычна, без рыўкоў і штурмаў своечасова выконваў ўскладзеныя на іх партыяй і ўрадам заданні.

Сакратар Магілеўскага РК КП(б)Б РЭВІНСКІ.
Старшыня райвыканкома ПУШЧЫН.
Старшыня райпрофсавета КУКСЕВІЧ.

Бочка гонару

„Рэальнасць нашай праграмы — гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатовасць працаваць па-новаму, наша рашучасць выканаць план" (Сталін)

За датэрміновае выкананне промфінплана 1934 года, узорную пастаўку вытворчасці і аўладанне тэхнікай «Звязда» заносіць на дошку гонару:

МІЛЕЎСКІ РАЁН

Сакратар РК КП(б)Б т. РЭВІНСКІ, старшыня РВК тав. ПУШЧЫН, старшыня райпрофсавета т. КУКСЕВІЧ.

15 СНЕЖНЯ прадпрыемствы Магілеўшчыны выканалі гадавы промфінплан.

17. ШОЎКАВАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КУЙБЫШЭВА.
Дырэктар фабрыкі тав. ЧОЛАХ, сакратар парткома т. ДРАБІНСКІ, старшыня фабкома тав. ІВАНОЎ.
Фабрыка скончыла гадавы промфінплан 29 лістапада.

18. СКУРЗАВОД ІМЯ СТАЛІНА.
Дырэктар завода т. ФРЭЙДЗІН, сакратар парткома т. АЛЬТШУЛЕР, старшыня фабкома т. ПІНСКІ.
Завод скончыў гадавы промфінплан 25 лістапада.

19. ЧЫГУНА-ЛІЦЕЙНЫ ЗАВОД ІМЯ ДЗІМІТРАВА.
Дырэктар завода т. ПАЖЫВІЛКА, сакратар парткома т. ГЕРШАНОК, старшыня фабкома т. БАЛАБКІН.
Завод скончыў гадавы промфінплан 20 ЛІСТАПАДА.

20. ДРУКАРНЯ ІМЯ МОЛАТАВА.
Дырэктар друкарні т. КІСІН, парторг т. МОТКІНА, старшыня групкома т. БАРЫСАЎ.
Друкарня скончыла гадавы промфінплан 29 ЛІСТАПАДА.

21. ЦАГЕЛЬНЯ № 7.
Дырэктар цагельні № 7 т. БАЕРАЎНІЧЫ, парторг тав. ЧАУБЕСАВА.
Завод скончыў гадавы промфінплан 15 ЛІСТАПАДА.

22. БЕТОННЫ ЗАВОД.
Дырэктар т. БЕЛЕНЬКІ, парторг т. ІВАНОЎ, старшыня заўкома т. ЕРМОНІК.
Завод скончыў гадавы промфінплан 1 СНЕЖНЯ.

23. ЛЕСАЗАВОД «ЗВЯЗДА»
Дырэктар т. РОШАЛ, парторг т. БАСІН, старшыня заўкома тав. КОРАНЬ.
Завод скончыў гадавы промфінплан 4 СНЕЖНЯ.

24. РЫМАРНАЯ ФАБРЫКА
Дырэктар ф-кі т. ЛІБО, парторг т. РУМКІН, старшыня фабкома т. ШМІДАЎ.
Фабрыка скончыла гадавы промфінплан 14 СНЕЖНЯ.

25. МЯСАКАМБІНАТ
Дырэктар т. БАЛТЭР, парторг т. ЦЫМБАРЭВІЧ, старшыня заўкома т. СОРКІН.
Камбінат скончыў гадавы промфінплан 12 СНЕЖНЯ.

26. ТОРФЗАВОД ХВОЙНА-МАСТОК
Дырэктар т. САКАЛОЎСКІ

27. БАТУНСКІ ВІНАКУРАНЫ ЗАВОД
Дырэктар завода т. СІВАКОЎ.
Завод скончыў гадавы промфінплан 14 СНЕЖНЯ.

28. ТАРФЗАВОД ГРЭБЕНЕВА
Дырэктар т. АРЦЮХОЎ, парторг МІНКІН, тарфком т. ГУШАНСКІ.

ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМА КП(б)Б

15 і 16 снежня адбыўся пленум Менгаркома КП(б)Б. Пленум заслухаў пытанні аб адмене картачнай сістэмы і становішчы марксісцка-ленінскага выхавання ў партарганізацыі.

Загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма Менгаркома КП(б)Б тав. **Варончанка** ў сваім дакладзе даў разгорнуты малюнак становішча партыйнай вучобы менскай партарганізацыі. Па гэтаму-ж пытанню выступіў загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б тав. **Конік.**

Выступаўшыя ў спрэчках члены пленума і партыйны актыў звярнулі асаблівую ўвагу на неабходнасць узмацнення барацьбы за якасць марксісцка-ленінскага выхавання, узмацнення большэвіцкай пільнасці і ідэалагічнай вытрыманасці ў рабоце партыйных школ.

Па Совецкаму Саюзу і Беларусі

ПЕРАМОГА ЧОРНАЙ МЕТАЛУРГІІ

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАН ГАДАВЫ ПЛАН ВЫПЛАЎКІ ЧЫГУНУ.

ЦК ВКП(б) — тав. СТАЛІНУ.
Соўнарком СССР — тав. МОЛАТАВУ.

Наркамцяжпром — тав. Орджанікідзе.

16 снежня заводы чорнай металургіі выканалі заданне партыі і ўрада на 1934 год. Краіна атрымала 10 млн. тон чыгуну.

Да канца года будзе выплаўлена 500 тыс. тон звыш плана. Такім чынам, рост выплаўкі чыгуну за адзін 1934 год складзе 3,4 млн. тон, або 48 процантаў.

Такіх тэмпаў росту не за якія гады не давала ні адна капіталістычная краіна.

Каэфіцыент скарыстання аб'ёму доменных пячэй, якія працуюць на коксе, палепшан у наступных размерах: у 1933 годзе — 1,69; у першым квартале 1934 г. — 1,43; у другім квартале — 1,27; у трэцім квартале — 1,29; у кастрычніку-лістападзе — 1,24.

***

Гэта перамога ёсць перамога нашай партыі, перамога сталінскай палітыкі індустрыялізацыі нашай краіны, рэзультат барацьбы ўсёй партыі за арганізацыю зорнай металургіі.

Гэта ёсць першыя вынікі рэалізацыі ў чорнай металургіі шасці пістарычных умоў тав. Сталіна, рэзультат штодзённага, канкрэтнага, большэвіцкага кіраўніцтва тав. Серго Орджанікідзе, які вучыў і вучыць металургаў, як працаваць па-сталінску і як перамагаць.

Рапартуючы партыі і ўраду аб поспехах 1934 года, армія металургаў, коксавікоў, работнікаў горнарудных і агнеўпорнай прамысловасці разумее, што дасягнутыя поспехі па выплаўцы чыгуну не даюць падставы ў якой бы там ні было ступені супакойвацца, і абавязвае прадаўжаць разгорнутае наступленне за выкананне плана 1935 года, за мабілізацыю ўсіх вытворчых рэзерваў, за лепшыя сусветныя тэхнічныя показальнікі, за выкананне пяцігадовага плана, за вырашэнне асноўнай задачы, пастаўленай т. Сталіным на XVII партз'ездзе, — ліквідаваць адставанне чорнай металургіі.

Начальнік Галоўнага ўпраўлення металургічнай прамысловасці А. ГУРЗЗІЧ.

Пленум МК і МГК ВКП(б) сумесна з партактывам

15 снежня ў Калонным зале Дома саюзаў адкрыўся аб'яднаны пленум МК і МГК сумесна з маскоўскім актывам. Пленум адкрыў сакратар МК і МГК тав. **Хрушчоў.**

У прэзідыум выбраны члены бюро МК і МГК.

Сход упазнаваў уставаннем пакланам **Сергея Міронавіча КІРАВА,** загінуўшага ад рукі класавага ворага.

Парадак дня пленума: 1. Вынікі лістападаўскага пленума ЦК; 2. Бягучыя пытанні: а) культурна палітычная работа ў вёсцы; б) мерапрыемствы па выкананню дзяржаўнага плана жывёлагадоўлі; в) аб насенных фондах; г) рамонт трактароў і с.-г. машын.

З дакладам па першаму пытанню — аб вынніках пленума ЦК і чарговых задачах маскоўскай партыйнай арганізацыі — выступіў спалучаны бурнай, доўга незмаўкольнай авацыяй тав. **Л. М. Кагановіч.**

Пасля заключнага слова т. Кагановіча пры бурных апладысментах, перарэўшых у авацыю, і выгуках «Нехай жыве ленінскі ЦК, няхай жыве наш родны Сталін» прынята прывітанне т. **Сталіну.**

У канцы пасяджэння абнагалосна прынята рэзалюцыя, якая ўхваляе рашэнні ЦК і намячае практычныя задачы маскоўскай партыйнай арганізацыі па выкананню рашэнняў пленума ЦК ВКП(б). (БелТА).

ВЫСОКАЯ СВЯДОМАСЦЬ СОВЕЦКІХ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ

МАСКВА, 15-XII. (БЕЛТА). Прэзідыум Вышэйшага совета фізічнай культуры СССР заслухаў паведамленне кіраўнікоў делегацыі совецкіх футбалістаў, лёгкаатлетаў і баксёраў, выступаўшых нядаўна ў Нарвегіі і Чэхаславакіі.

Гаворачы пра арышт совецкіх лёгкаатлетаў у Кошыцах (Чэха-Славакія), які з'явіўся вынікам правакацыі з боку фашысцкіх элементаў, ВСФК падкрэслівае высокую свядомасць усёй спартыўнай делегацыі, якая ў часе прабывання за мяжой сваімі паводзінамі паказала палітычную спеласць совецкіх фізкультурнікаў.

ВСФК даручыў маскоўскаму, ленінградскаму, кіеўскаму і харкаўскаму советам фізкультуры ў мэтах шырокай папулярызацыі вынікаў апошніх выступленняў совецкіх фізкультурнікаў за граніцаю, г... несці спецыяльныя сходы футбалістаў, баксёраў і лёгкаатлетаў.

АБ ФАКТАХ АБАРТАВАННЯ КОНЕМАТАК

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 5 снежня 1934 г.

Па маючыхся вестках у ЦК аб значных выпадках абартавання конематак і дадатковых фактах, ускрытых на праходзіўшай 29 лістапада радыёперакліччы па пытаннях падрыхтоўкі жывёлы да зімоўкі, ЦК устанаўляе, што ў цэлым радзе раёнаў (Слуцак, Асвея, Капыль, Быхаў і інш.) справа захавання і развядзення конскага паголоўя прадастаўлена самацёку. Мясцамі прапелікідзія адносіны да жарэбных матак не сустракаюць рэзкага адпору, факты абартавання прахоўваць часта незаўважанымі, няма сапраўднай большэвіцкай барацьбы за паманалічны ход жарэбкі, за захаванне кожнага жарабяці. Тэлекі гэтым можна тлумачыць, што ў Слуцкім раёне зараз зарэгістравана 150 выпадкаў абартавання.

ЦК даручае пракурору рэспублікі тарміновае расследаванне прычыны такога значнага абартавання і рэзультаты дадаўжыць на Бюро ЦК, даць таксама ўказанне райпракурорам іншых раёнаў уважліва і хутка правядзіць слеціыя справы аб варварскіх адносінах да каня.

Даручыць РК партыі, палітаддзелам неадкладна выявіць усе выпадкі неахайных, злачынных адносін да каня, факты абартавання і на гэтых фактах разгарнуць шырокую, сапраўдны большэвіцкую барацьбу ў калгасах, саўгасах, сярод адназасобнікаў за добрага каня, за маладняк.

ЦК звяртае ўвагу РК і палітаддзелаў на тое, што з іх боку ні ў якай меры не пакінна асаблівая работа па сістэматычнай праверцы складу конюхаў як у калгасах, так і ў саўгасах, неадкладнаму знішчэнню класава-чужых, кулацкіх элементаў, лодырыў і разгільдяяў і ўзмацненню складу конюхаў за лік праверэных, актыўных калгаснікаў і сельскагаспадарчых рабочых, заахвочваючы лепшых конюхаў і шырока папулярызуючы іх вопыт для таго, каб па іх раёны ліся адстаючыя.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРАКУРАТУРЫ РЭСПУБЛІКІ

Праведзеным расследаванем фактаў масавага абарціравання конематак у калгасе імя Будзённага, Серэднякоўскага сельсовета, Слуцкага раёна, — дзе па конегадоўчай ферме за кастрычнік-лістапад абартавала 26 конематак, — устаноўлена, што кулакі, пралезшыя ў калгас на работу ў конегадоўчую фему драпежніцку эксплуатавалі жарэбных матак, збівалі іх, дрэнна кормілі. Гэта выклікала масавае абарціраванне.

Па справе затрымана 6 асоб. У бліжэйшыя дні справа будзе разглядацца на месцы ў показальным парадку.

Нам. пракурора рэспублікі ГЛЕЗЕРАЎ.

ЗОРНАЯ ЛЫЖНАЯ ЭСТАФЕТА ЧЫГУНАЧНІКАЎ

МАСКВА, 15 снежня. (БЕЛТА). **Палітупраўленне НКШЗ,** газета **«Гудок»** і прафсаюзныя арганізацыі чыгуначнікаў праводзяць зорную лыжную эстафету імя VII з'езда совецтаў. Задачы эстафеты — уцягненне шырокіх мас чыгуначнікаў у актыўны ўдзел у выбарах совецтаў; праверка гатоўнасці транспарта да снегабарацьбы і зімніх перавозак і шырокае развіццё фізкультуры на транспарце.

Фініш эстафеты — у Маскве ў дзень адкрыцця VII з'езда совецтаў.

Для правядзення эстафеты пры палітупраўленні НКШЗ арганізаваны цэнтральны штаб. Такія-ж штабы арганізаваны пры дарогах.

ЗЕМЛЯРОБСТВА НА БАЛОТНЫХ ГЛЕБАХ

МАСКВА, 15 снежня. (БЕЛТА). На чарговым пасяджэнні прэзідыума Акадэміі сельска-гаспадарчых навук імя Леніна заслуханы даклады аб рабоце ўсесаюзнага балотнага інстытута. Інстытут, арганізаваны на базе Менскай балотнай станцыі, праводзіць цікавую работу па культурнаму асваенню забалочаных зямель. У Беларусі асушана ўжо некалькі дзесяткаў тысяч га, вывучаюцца балоцістыя глебы Горкаўскага края. Дзве экспедыцыі інстытута працавалі ў барабінскіх лесах (Заходняя Сібір), дзе пачата ўжо асваенне 4 млн. га забалочанай зямлі.

Інстытутам вывучаны пытанні развядзення на балоцістых землях розных сельска-гаспадарчых культур. У Беларусі ўжо зараз на асушаных балотах арганізавана 20 жывёлагадоўчых і некалькі калгаснаводчых саўгасаў. Інстытут устанавіў, што з кожнага гектара асушаных балот можна атрымаць каля 470 цэнтнераў кармоў.

У мінулым годзе інстытут на асушаных землях БССР засеяў некалькі га каўчуканосамі: кок-сагызам і крым-сагызам. Каўчуканосы вельмі добра прыняліся, добра перанеслі зіму. Доследы паказалі, што кароткі кок-сагыз, вырошчаны ў Беларусі, змяшчаюць 7,3 процанта каўчука. Кзнэтнік (валакністая расліна, якая ідзе на выраб мяшкоў і шпагату) даў на асушаных балотах 40 цэнтнераў спяла з гектара. Найлепшыя рэзультаты дасягнуты з пасевам тэпінамбура (земляной грушы). Расліны дасягалі вышыні у 3,5 метра, а ураджайнасць — 200 цэнтнераў з га.

На асушаных глебах Беларусі добра развіваюцца махорка, бакуш (сорт табаку), сігарныя табакі і рэвень (расліна, з лісцяў якой вырабляецца пэдзла і варэнне).

За рубяжом

УЗМАЦНЕННЕ АНТЫФАШЫСЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 15 снежня. (БЕЛТА). «Юманітэ» і «Попюлер» апублікавалі зваарот узгадняльнага камітэта комуністычнай і соцыялістычнай партый Францыі. У звароце падкрэсліваецца значнае ўзмацненне дзейнасці фашысцкай арганізацыі ва Францыі і актывізацыя фашысцкіх сіл у Германіі, Іспаніі і ў Саарскай вобласці. Камітэт указвае на неабходнасць мабілізацыі працоўных і ўзмацнення інтэрнацыянальнай пролетарскай салідарнасці для барацьбы супроць фашызма.

У сувязі з гэтым,—гаворыцца ў звароце, — узгадняльны камітэт рашыў: 1) арганізаваць у Парыжы і ва ўсіх буйных гарадах, прылягаючых да граніц Іспаніі і Саарскай вобласці, масавыя мітынгі пад лозунгам раззбраення і роспуску фашысцкіх арганізацый, барацьбы супроць забароны, дэманстрацый і замахаў на дэмакратычныя свабоды і на жыццёвы ўзровень працоўных, за падтрыманне рэвалюцыйнай барацьбы працоўных Германіі, Іспаніі і Саарскай вобласці; 2) правесці ва ўсіх комуністычных і соцыялістычных муніцыпалітэтах кампанію пратэсту супроць праекта змяншэння праў абшчын; 3) арганізаваць у дэпартаменце Луары масавыя сходы ў мэтах аказання дапамогі бастуючым рускім тэкстыльшчыкам.

БЕНЕШ АБ ПАЛІТЫЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ У ЕЎРОПЕ

ПРАГА, 15 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляе чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва, **Бенеш** (міністр замежных спраў Чэхаславакіі) выступіў на вялікім адкрытым сходзе з дакладам аб рашэннях совета Лігі нацый.

Паводле слоў Бенеша, распачатая пасля мірнай канферэнцыі барацьба паміж паасобнымі еўрапейскімі дзяржавамі і тайныя ўзбраенні некаторых краін зусім змянілі палітычную і дыпламатычную абстаноўку Еўропы. Бенеш падкрэсліў, што, уступіўшы ў Лігу нацый, СССР зблізіўся з Францыяй і не саюзнікамі і стварае разам з Францыяй, Малай Антантай і балканскай Антантай буйны мірны блок, які не накіраван ні супроць каго і, у прыватнасці, не накіраван супроць Германіі.

Пры дапамозе далейшых перагавораў, на думку Бенеша, можна-б было дабіцца распаўсюджання гэтага фронта з прыцягненнем Германіі. Вырашэнне саарскай праблемы магло-б, паводле слоў Бенеша, пераш за ўсё адкрыць дарогу да далейшых перагавораў аб усходнім пакце.

Аднак, для таго, каб забяспечыць мір таксама і на той выпадак, калі не ўдасца дабіцца ажыццяўлення ўсходняга пакта, у сучасны момант **адбываецца зближэнне Францыі і іншых еўрапейскіх краін з Совецкім Саюзам.**



Пасля няўдалай спробы паўстання ў ліпені 1934 г. напі... 2.000 аўстрыйскіх фашыстаў, кіруемых гітлераўскімі агентамі, уцяклі ў Югаславію, дзе былі інтэрнірованы. Цяпер ім дазволена пакінуць Югаславію і ўехаць у Германію.

На здымку: Пасадка вызваленых фашыстаў у парту Фіума на нямецкі параход.

З'ЕЗД РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ МЕТАЛІСТАЎ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 15 снежня. (БЕЛТА). Адкрыўся з'езд унітарнай (рэвалюцыйнай) федэрацыі металістаў Францыі.

У гапаровы прэзідыум з'езд выбраў тт. **Лазоўскага, Шверніка, Тальмана,** арыштаванага ў Іспаніі французкага прафсаюзнага дзеяча **Рабата** і сакратара ўсеагульнай унітарнай канфедэрацыі працы Францыі Жуо. ...ы металістаў Круэза зрабіў даклад аб дзейнасці федэрацыі.

На тэмы дня

УВАГА РАЁННАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

Мала знойдзецца ў Беларусі райкомаў партыі, якія-б маглі сказаць, што на працягу апошняга года яны хоць раз заслухалі даклад аб рабоце раённай бібліятэкі на бюро райкома. Мала хто з сакратароў райкомаў мог-бы расказаць, як яны аказваюць бібліятэцы істотную дапамогу — памяшканнем, людзьмі, апалам, кнігамі, сродкамі.

А варта было-б! Варта было-б, каб работу раённай бібліятэкі вынесці на абгаварэнне бюро райкома партыі, прэзідыума райвыканкома і дабіцца таго, каб раённая бібліятэка заняла тое пачэснае месца, якое ёй адведзена ў агульнай сістэме інтэрнацыянальнага выхавання мас.

Справа ў тым, што з ростам культурных запросаў самых шырокіх слаёў насельніцтва бібліятэка набывае асаблівае значэнне ў сэнсе задавалення працоўных кнігамі па ўсіх галінах ведаў. Зараз, бадай, што няма ні аднаго раённага цэнтра, дзе-б не было больш-менш буйной бібліятэкі. Мы маем у раёнах 75 бібліятэк з агульнай колькасцю звыш поўмільёна экземпляраў кніг. Толькі за 1934 год бібліятэкі атрымалі 164.000 кніг, не лічачы вялікай колькасці кніг, якая пайшла ў вёску па лініі палітасветдзелаў. Распашнае пашырэнне бібліятэк гае магчымасць задаволіць і разнавараго чытача навінкамі кніжнага рынку.

Але тым не менш чытачы з цяжка раду раённаў скардзяцца, што раённыя бібліятэкі іх не задавальняюць, што атрымаць не толькі патэбную, але і пасэтэ кнігу ў бібліятэках нелёгка. У чым справа?

Ёсць бібліятэка ў мястэчку **Бешанковічах.** На дзвярах нават абвешана вісіць: «Бібліятэка адкрыта з 6 да 9 т. вечара». Але замыкаецца той, хто паверыць абяцанне, бо бібліятэка заўсёды на замку.

Звыш поўгода не працуе **дубровенская** раённая бібліятэка. І тут кніжныя шафы закрыты, а работнікі бібліятэкі недзе гуляюць.

Ніколі не знойдзеш кнігі ў чытальні пры бібліятэцы мястэчка **Бярэзіна.** Праўда, і ў бібліятэцы вельмі мала кніг.

Перад бібліятэкамі й бібліятэчным работнікамі стаяць адказныя задачы па культурнаму абслугоўванню і інтэрнацыянальнаму выхаванню маладога пакалення і ўсіх працоўных. Трэба каб усе партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі аружылі бібліятэкі штодзённай увагай і аказвалі практычную дапамогу ў іх рабоце. Толькі пры гэтых умовах мы здолеем забяспечыць нармальную работу бібліятэк і змогам ад іх патрэбаваць, каб яны сапраўды цалкам задаволілі ўсе патрэбнасці працоўных.

Большэвіцкае прывітанне з'езду советаў Аршаншчыны

ТАВ. СОСКІН

СОСКІН.
сакратар Аршанскага райкома КП(б)Б

◆ ◆ ◆

ТАВ. МІЦЬКОЎ

МІЦЬКОЎ.
старшыня Аршанскага райвыканкома

АД ЧОРНАЙ ДА ЧЫРВОНАЙ ДОШКІ

З часу папярэдніх выбараў у советы мінула 4 гады. Аршаншчына, якая ў недалёкім мінулым была адсталым раёнам і знаходзілася на чорнай дошцы, зараз, на аснове няўхільнага выканання дырэктыў партыі і ўрада, пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным дапамозе ЦК партыі і асабста тав. **Гікало,** ліквідавала сваё адставанне, вышла ў перадавыя рады раёнаў рэспублікі і да раённага з'езда советаў прыйшла з буйнейшымі поспехамі.

За апошнія гады раён узбагаціўся буйнейшымі прадпрыемствамі, якія маюць не толькі рэспубліканскае, але і саюзнае значэнне.

На непраходных асінаўскіх балотах вырасла **гіганцкая электрастанцыя імя тав. Сталіна.** З яе нетраў па правадах пульсуе энергія, якая рушыць варштаты сотень фабрык і заводаў, свеціць, малоціць і іншую работу спраўляе ў сотнях калгасаў і соўгасаў Оршы, Віцебска, Магілева і ў суседніх раёнах.

Дзеяпічча першай пяцігодкі—**мясакамбінат**—адзін з 518 гігантаў—працуе на поўную магутнасць. Ён узброен навейшай тэхнікай.

Побач з мясакамбінатам расце волат ільняной прамысловасці—**ільнокамбінат.** Адзін яго цэх—ільночасальная фабрыка—ужо дзейнічае.

Гэтымі днямі ўступае ў строй буйны сілікатны завод, які дасць у год 11,5 мільёна агнетрывалых цэгін для будаўніцтва новых фабрык і заводаў.

На ўзгорку, Наадроўскага поля, дзе рос бур'ян ды калцатыя хвойкі, вырас новы хлебакамбінат.

За 4 гады пік прадпрыемстваў раёна павялічыўся з 35 да 65 адзінак.

Узрасла валавая прадукцыя прамысловасці. У 1930 годзе яна складала 4.141 тыс. рублёў, а ў бягучым годзе ўжо складае 37.578 тыс. рублёў, гэта значыць рост на 809,5 проц. Мяшчанская ў мінулым Орша ў даны момант налічвае 14.689 рабочых.

Знізаецца сабекошт прадукцыі. Промфінплан па саюзна-рэспубліканскай прамысловасці за 9 месяцаў гэтага года выкананы на 100,7 проц. Горш працуе мясцовая прамысловасць, выканаўшая за той-жа час промфінплан толькі на 90 проц.

Самапромкааперацыя за апошнія гады па колькасці членаў вырасла ў два разы і зараз у арцелях налічваецца 1.800 чалавек. Прадукцыя прамысловай кааперацыі вырасла прыблізна ў 5 раз і ў гэтым годзе будзе складаць звыш 10.800 тыс. рублёў. Вяровачная арцель «Дняпро» налічвае 700 чалавек.

Аднак, застаецца бясспрэчным факт, што многія арцелі яшчэ працуюць незадавальняюча, промфінпланаў сваіх далёка не выконваюць.

Вялікім недахопам з'яўляецца той факт, што ў раёне да апошняга часу не была звернута належная ўвага на арганізацыю такіх арцелей, якія працуюць на мясцовай сыравіне (гліна, камень, смала, дрэва).

Наша задача—у перадавым раёне арабіць перадавой па ўсіх пазазальніках і прамысловасць.

Уздым работы ў раёне, асабліва па сельскай гаспадарцы, пачаўся з мая 1933 года. Імкнна на тэты час адносіца рашучае ўмяшанне ПК КП(б)Б. Суровая адзнака недахопаў, замена партыйнага і совецкага кіраўніцтва, арганізацыя палітдзвароў і ўдарніцтва, арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва, барацьба за пяршынства выхавалі нямала добрых кіраўнікоў брыгад.

Ужо ў мінулым годзе Аршанскі раён пачаў займаць пяршынства ў рэспубліцы па раду палітычна-гаспадарчых кампаній. 1934 год прынёс новыя перамогі. Аршаншчына ў спісныя тэрміны закончыла ўсе важнейшыя палітычна-гаспадарчыя кампаніі. Сяўба яравых праведзена за 25 дзён, замест 51 дня ў 1932 годзе. Уборка ўраджаю праведзена за 22 дні—на 49 дзён раней мінулага года.

Азімая сяўба на плошчы 35.500 гектар праведзена за 17 дзён — на 32 дні раней мінулага года.

Зяблевае ворыва—38.200 гектараў—праведзена на 25 дзён раней мінулага года.

Выкананне абавязкаў перад дзяржавай—хлебапастаўкі і здача натураплаты за работу МТС, на чым правяраецца большэвіцкая боязадольнасць партарганізацыі, советаў і калгасаў—ў раёне праведзена: хлебапастаўкі за 15 дзён, а разам з натураплатай — за 25 дзён замест 75 дзён у мінулым годзе і на 6 месяцаў раней мінулага года.

Загатоўкі ільносемя выкананы да 1 верасня, на 6,5 месяцаў раней мінулага года; загатоўка ільноваланна скончана да 1 лістапада, на 6 месяцаў і 20 дзён раней мінулага года.

І, нарэшце, самаабавязацельства **па хлебазакупках** як і большасць важнейшых палітычна - гаспадарчых кампаній, **раён выканаў першым па рэспубліцы**—да 19 лістапада.

Вырасла ўраджайнасць калгасных палёў. Калі ў 1930 годзе зярновыя давалі з гектара ў сярэднім 7-8 цэнтнераў, а бульба—92 цэнтнеры, то ў гэтым годзе зярновыя далі ў сярэднім 10-11 цэнтнераў, а бульба —115 цэнтнераў з гектара.

Гэта—вынік таго, што калгасы авалодваюць агратэхнікай, лепш апрацоўваюць глебу, бо на іх палях працуюць складаныя машыны.

Вырасла вага працадня калгасніка ў 2 разы параўнальна з 1932 годам. У 1932 годзе зярновых на працадзень прыпадала ў сярэднім 1,5 кгр., сёлета—3 кгр., бульбы адпаведна: 3,5 кгр. і 9 кгр. Дзесяткі і сотні калгасных сем'яў, шчыра працаваўшых на працягу года, ужо дабіліся заможнага жыцця.

На аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, росту заможнасці калгаснікаў і правядзення сярод працоўных аднаасобнікаў масава-палітычнай работы раён упэўнена ідзе да суцэльнай калектывізацыі. Зараз у 288 калгасах рабіна аб'яднана 14.147 гаспадарак, або 85 проц. За апошнія 2 гады ў калгасы прыйшлося каля 3.000 гаспадарак, або 20 проц. агульнай колькасці гаспадарак раёна.

Разам з калектывізацыяй вёска насыцілася навейшай машыннай тэхнікай.

У калгасах і соўгасах раёна працуе 59 складаных і поўскладаных малатарань, 12 трактарных сноапвязалак, 35 конных, 391 жнеярка-самаскідка, не гаворачы ўжо аб касілках і конных малатарнях. За тры апошнія гады поўнасцю электрыфікаваны 5 соўгасаў і 23 калгасаў. Устаноўлены 33 маторы для электрамалаціьбы. Электрычнасцю рухаюцца ў калгасах корнерэзкі, пампуецца вада, рэжацца гонта і т. д. Агульная магутнасць электраўстановак у калгасах—796,5 квт. **Лямпка Ільіча свеціць у тысячах хат калгаснікаў.**

Побач з буйнейшымі поспехамі раёна ў сацыялістычным будаўніцтве, **самым слабым участкам застаецца справа жывёлагадоўлі.**

Праўда, у гэтым годзе параўнальна з мінулым палепшылася колькасць цялят. Лік буйной жывёлы падняўся да 31.123 замест 27.884 галоў у мінулым годзе. Аднак, колькасць коней застаецца на леташнім узроўні. Пагалоўе-ж свіней і авечак нават зменшылася.

Адначасова з бурным ростам эканомікі раёна расце і культура—нацыянальная па форме, сацыялістычная па зместу. Адзін характэрны паказальнік. У 1930-31 годзе па бюджэту на культурнае будаўніцтва было асігнавана 1.077 тыс. руб., у 1934-35 годзе—3.597 тыс. руб.

Небывалы рост творчага энтузіязму і палітычнай свядомасці мас, што асабліва ярка выявіліся ў часе выбараў советаў (прымала ўдзел 92,2 проц. усіх выбаршчыкаў раёна), вялікая актыўнасць жанчын (удзельнічала ў выбарах 90 проц.) з'яўляюцца лепшай гарантыяй таго, што партыйная арганізацыя, камсамол, советы і калгасы раёна, выкрываючы недахопы ў рабоце, пад кіраўніцтвам ПК КП(б)Б на чале з таварышам Гікало з яшчэ большым поспехам будуць змагацца за пяршынства раёна, за справу партыі, за сацыялізм.

ГІСТОРЫЯ ГОРАДА ОРШЫ

«Горад Орша існаваў ужо ў XII стагоддзі, у 1116 годзе князь Вячэслаў, сын Уладзіміра Манамаха, узяў «Р» шу и Копысь»...

У горадзе тры праваслаўных цэрквы, з якіх дзве каменныя, і мужчынскі пакроўскі манастыр, у якім ёсць адна каменная цэрква. Нарэшце, у горадзе знаходзіцца рымска-каталічны каменны касцёл, яўрэйская сінагога і каля 10 яўрэйскіх малітэвных школ.

Не гледзячы на выгоднае месцараспалажэнне, Орша адзначаецца адносная беднасцю свайго жыцця.

У Оршы бывае адзін ў годзе нязначны кірмаш 9 мая. Розная роду прамысловых устаноў у горадзе налічваецца больш 40 з больш чым 200 рабочымі. Жыхароў у Оршы каля 15 тысяч. Даходы горада складаюць звыш 19.000 рублёў»...

(З кнігі «Россия. Полное географическое описание нашего отечества, под редакц. Семенова»).

СУЧАСНАЯ ОРША

Расквітнеў горад ОРША толькі пасля Окцябрскай рэволюцыі, асабліва ў гады першай і другой пяцігодкі вырасла прамысловасць і культура горада.

У горадзе восем клубаў, два кінатэатры; заканчваецца будаўніцтва новага тэатра на 1.000 месц. У горадзе толькі сярэдніх школ 10 два тэхнікумы, рабфак. Усе дзеці працоўных ахоплены школамі, нягрматнасць ліквідавана. Урэшце, у горадзе арганізаван зарэклуб.

Мяшчанскі ў мінулым горад становіцца цэнтрам буйнай сацыялістычнай прамысловасці.

65 прадпрыемстваў раёна з лікам 14.689 рабочых. Валавая прадукцыя прамысловасці ў апошні год складае 37.578 тыс. руб. плюс прамысловай кааперацыі 10 000 тысяч руб. Таваразвазот у кааперацыі дасягнуў 50 мільёнаў руб. у год. Па бюджэту даходы раёна вызначаюцца ў 6 519 тыс. руб.

Насельніцтва ў горадзе звыш 40 000 чалавек. Будуюцца новы рабочы пасёлак Ільнокамбіната на 16.000 чалавек. (Са справаздачы старшыні горсавета).

МАКСІМЕНКА КУЗЬМА —
старшыня калгаса «Х з'езд советаў», Зубаўскага сельсавета.

ШЛЯХ КАЛГАСА „Х З'ЕЗД СОВЕТАЎ"

Да 1930 года былыя батракі Чычкова працавалі ў таварыстве на сумеснай апрацоўцы зямлі. Побач была заможная аднаасобная вёска Ляўкі. Тут здзіраваў кулакі, былыя паліцэйскія, падтулачнікі. Але-ж не надоўга. У хуткім часе раскулачылі іх і выслалі. У вёсцы Ляўкі арганізаваўся калгас «Х з'езд советаў». Таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі зліўся з калгасам.

Мінуў 1930, 1931 год. Не лажэлася справы ў калгасе. Адны калгаснікі працавалі, другія пасмейваліся: «Праца дурняў любіць».

Так было да 1932 года. Калгас лічыўся прарыўным. Зрынаў усе гаспадарча - палітычныя кампаніі. Заглыбіўшы глыбей, мы ўбачылі, што членам праўлення калгаса і скарбнікам сяды ці былы капітан **Каваленка**, з ім у кампаніі «калгаснікі» **Бардасевіч**—былы стражнік, **Чмакаў** — былы ўрадник, ліцэнцы **Баразновы** — забойцы селькора.

Выгналі з калгаса класавых ворагаў. Сем сем'яў вычысцілі, згуртавалі вакол парт'ячэйкі актыў. У гэты час улілося 15 гаспадарак беднякоў і сераднякоў. Па-новаму пачалі працаваць.

Да 1932 года не было ў калгасе брыгад. Арганізаваў я дзве брыгады. Адставала брыгада № 2 (брыгадзір **Вайцахоўскі**). У гэтым-жа годзе гэта самая брыгада — перадавая. Моцна ўзяліся мы за палі, гэта — важна. Увялі правільны севазварот — восем палёў і чарсуем культуры акуранча, па таблі цах.

Добры догляд палёў — і ўраджай добры: жыта 12 цэнтн., пшаніцы — 13,5 цэнтн., ячменю — 13, аўса — 12, бульбы — 127 цэнтнераў. Дзяржаве здалі 17 тон зярна. Ільнозагатоўкі выканалі, здалі звыш плана 16 цэнтнераў.

На працадзень прыпадае 3,7 кгр. хлеба, 11 кгр. бульбы і грошай па 60 кап. Вось калгаснік **Чарнасёў Еўдакім** (былы батрак) з сем'ёй у 4 душы на свае працадні атрымлівае 300 пудоў хлеба, 854 пуды бульбы і 856 руб. грошай; ён мае аграча таго карову, 2 авец, 3 свіней.

Такі шлях прайшоў калгас «Х з'езд советаў» за 4 гады. Як прытожа змяняецца жыццё.

Па сядах аднаго аглядзу

САМАКРЫТЫКА ПА ЛЕЛЬЧЫЦКУ

І лістапада «Звязда» змясціла агляд лельчыцкай газеты «Калгаснік на варце». У агляде былі ўскрыты сур'ёзныя памылкі радыцыі.

«Лельчыцкі раён, — гаварылася ў агляде, — займае адно з апошніх месц у Беларусі па калектывізацыі. Але раённую газету «Калгаснік на варце» гэта мала турбуе. Яна спадзяецца на самацёк».

Газета не ставіла пытання аб тым, чаму ў раёне застой у справе калектывізацыі. Наадварот, рэдакцыя з заблівым старанням пальфарбоўвала факты. Пасля зіўшы самакрытыку за голодны паёк, «Калгаснік на варце», пісаў аб «магучым прыліве па раду калгасаў раёна». А ў адным нумары пасведчала працяжае мудрэлад пасведчала працяжае мудрэлад пасведчала працяжае мудрэлад

На раённых з'ездах советаў

АБ ЧЫМ НЕ ГАВАРЫЛІ ДАКЛАДЧЫКІ

13 снежня закончыў сваю работу VII з'езд советаў Чэрвеньшчыны. З'ездам быў заслуханы справаздачны даклад старшыні райвыканкома тав. БУШМАНА і даклад райземаддзела аб арганізацыйна - гаспадарчым ўмацаванні калгасаў і развіцці жывёлагадоўлі. Старшыня райвыканкома ў сваім дакладзе вялікі многа гаварыў аб дасягненнях, якіх дабіўся раён за справаздачны перыяд, а загадчык райземаддзела БУЯНАЎ у сваім дакладзе ганяўраў БУШМАНА. Але ніводзін ў іх не атрымліваўся. Яны прыводзілі лічбы кожны па сваёму.

Старшыня калгаса «1-шы май» тав. ВАСЬКО ў сваім выступленні расказвае:

— Тры гады назад у нас было 8 чыстых коней, а цяпер яны маем 62 коней, 183 кароўы, 44 свінкі, 36 авечак і пчаліную пасеку ў 70 вуллеў. Мы своечасова рэалізаваліся з дзяржавай, прадалі 21 пуд хлеба і ў гонар з'езда прадаем дадатковы тры тоны.

І ВАСЬКО пагрэбліва перадае вопыт работы. Уважліва слухаюць. Многія аб гэтым і не чулі. Наогул да перадачы вопыту лепшай работы ў Чэрвеньшчыне не прывыклі. Кожны калгас жыве сваім уласным жыццём. Раённы работнік, якія выязджаюць у калгасы, не лічаць патрэбным вывучаць вопыт работы калгаса, не пазнаёмяцца ў сельсавеце. У гэтым прызнавалася на з'езде сакратар райкома партыі тав. ВАСІЛЬЕВА.

Райпрамурор тав. БРОНЕЙЗІН прыводзіць факты, якія гаворяць аб крытычных знішчэннях коней і сыроты маладняка.

— На тале калгаса «Профінтэрн» доўгі час стаяў кулак СКУРАТОВІЧ. Старшыня Войнілаўскага сельсавета БУРНЕВІЧ выкананаў волю кулака РЭУТОВІЧА. Працавалі работу. Але гэта не перашкодзіла БУРНЕВІЧУ папасці дэлегатам на з'езд.

БРОНЕЙЗІН расказвае, як плодзіць, бодра ведаючы злачынства асобных работнікаў, кіраўнікі раённых арганізацый бралі над сваю абарону, перашкаджалі пракуратуру вымяраць гэтыя злачынствы. У Вальжанскім сельсавеце кіраўніком быў Шут. Ён цалкам працаўся класайму ворагу і рабіў тое, што загадваў яму кулак. МІСЛЕВІЧ абкрадваў насельніцтва Дамавіцкага сельсавета.

Работнікі раёна ў сельсоветах не займаліся пытаннем культурна-выхаваўчай работы. Яны выжжалі ў сельсавет. Нічога там не рабілі і ні перад кім не адчытваліся.

Усё гэта ніадрэзна скарыстоўваў класавы вораг для развалу работы калгаса, асабліва па Горнаўскаму, Хутарскому, Вальжаноўскаму і іншых сельсоветах.

Вось што прынёс раён да чорнай дошкі. Няма такога мерапрыемства ў раёне, якое-б было праведзена ў тэрмін. Ніводзін раён не выканаў (усяго на 93 працанты), плана па хлебапастаўках. Хлебазакупкі не перасягнулі 60 працантаў. План мабілізацыі сродкаў правалены.

Аб кепскай пастаноўцы работы ў школах, аб недабалугоўлівай часельлічбна многа гаварыў дэлегаты з'езда. Выказалася каля 70 чалавек. Дэлегаты не толькі крытыкавалі гнебны правал у работе, але і давалі практычныя ўказанні, што трэба рабіць для таго, каб вывесці раён ў рады перадавых.

Упаўнаважаны ЦВК і СНК БССР тав. АШАК, закрываючы з'езд Советаў гаварыў:

— Наш з'езд пройдзе пад знакам жорсткай большэвіцкай крытыкі. Прадстаўнікі ад палавых брыгад, жывёлагадоўчых ферм гаварылі аб тым, чаго не хацелася гаварыць даклядчыкам. Гэта гаворыць аб тым, што калгаснікі-ўдарнікі з большэвіцкай энергіяй змагаюцца за ажыццяўленне генеральнай лініі нашай партыі...

***

Актыўна выбран новы склад райвыканкома. Выбраны лепшыя калгаснікі - ударнікі і ўдарніцы. Усяго выбраны 43 члены РВК з іх жанчын 13. Дэлегаты абвясцілі сябе ўдарнікамі па выкананню гаспадарча - палітычных кампаній. Яны абавязаліся да 25 снежня закончыць хлебазакупкі, дабіцца выканання плана 1934 года.

Пленум аднагалосна выбраў старшынёй райвыканкома тав. **СУРБА Васілія Вікенцьевіча.**

А. МАНЬКОЎ.

ДА З'ЕЗДА НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ

ПУХАВІЧЫ. (На тэлефону)

15 снежня адкрыўся VII з'езд советаў Пухавіцкага раёна. Першы дзень работы з'езда паказаў, што падрыхтоўка да яго была праведзена недавальняюча. На з'езд было выбрана 209 дэлегатаў, а ў першы дзень з'явіліся толькі 175 чалавек. 34 дэлегаты нават не ведалі аб з'ездзе і не з'явіліся.

З Голацкага сельсавета не з'явіліся 4 дэлегаты. Старшыня сельсавета **Бачыла** разнёў механіка замяніць гэтых дэлегатаў, прыслаўшы на з'езд на выбраных (Кайзель, Прахорчык і Трапашка).

У рабоце з'езда прымаюць удзел толькі 3 аднаасобнікі. Гэта рэзультат яўнай недаацэнкі аднаасобнага сектара, які складае амаль палову гаспадарак у раёне.

ЛОСЬ.

АД РЭДАКЦЫІ:

Карэспандэнцыя тав. Лося сігналізуе аб зусім дрэнняй падрыхтоўцы да з'езда советаў у Пухавічах. Раённыя арганізацыі своечасова не прынялі мер, каб не дапусціць парушэнняў совецкай канстытуцыі (высылка на з'езд не выбраных дэлегатаў).

Факты, прыведзеныя ў карэспандэнцыі, гавораць аб тым, што ў раёне працягваецца недаацэнка аднаасобніка, што сігналы «Звязды» ігнаруюцца раённымі арганізацыямі.

Памылкі, дапушчаныя ў Пухавічах, павінны паслужыць урокам для ўсіх раёнаў БССР.

РАЗ'ЮШАНЫ КЛАСАВЫ ВОРАГ ТЭРАРЫЗУЕ СЕЛЬКОРАЎ

(Пісьмо рахункавода калгаса).

АД РЭДАКЦЫІ:

Змяшчаючы пісьмо т. Барая і рэзультаты расследавання яго, «Звязда» лічыць, што прыведзеныя факты заслугоўваюць выключнай увагі.

Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, на вачах якіх рабіліся гэтыя злачынствы, дапусцілі свае гніла-ліберальныя адносіны да класавых ворагаў грубую палітычную памылку. Яны не выкрылі тактыкі кулацкага тэрарыста — старшыні калгаса Рудзені.

«Звязда» патрабуе ад раённых арганізацый неадкладнага рэагавання. «Звязда» таксама просіць пракуратуру рэспублікі прыцягнуць да суровай адказнасці кулацкіх тэрарыстаў, якія здзекуюцца з селькораў.

У лістападзе 1933 года **Старобінскім** РК ЛКСМБ я быў накіраваны у калгас «**Новы свет**», Доўгаўскага сельсавета, у якасці рахункавода і комсамольскага арганізатара калгаса.

Узяўшыся як след за работу, за кароткі тэрмін добра наладзіў калгасны ўлік. Адначасова я ўсяўся за правядзенне масавай работы ў калгасе. Уцягнуў моладзь у добраахвотныя брыгады, наладзіў выпуск насценгазеты.

З гэтага часу сам я стаў актыўным селькорам раённай газеты. Праз друк выкрываў злачынствы ў калгасе, змагаўся супроць зажымшчыкаў самакрытыкі.

За малейшае крытычнае выступленне калгаснікі на сходзе старшыня калгаса **Рудзеня Трахім** называў яго кулаком і інш. Многія калгаснікі за крытыку былі арыштаваны, а калгаснік Рудзеню Хведара праўдзіва выключыла нават з калгаса. Рудзеня прысвоіў шмат калгасных грошай, за якія сістэматычна п'янстваваў.

За тое, што я выкрываў гэтыя злачынствы Рудзені, ён пачаў мне помсціць. Аднаго разу Рудзеня, прыехаўшы п'яны са Старобіна, страбіў на мяне замах, стрэліўшы з нагана з-за вугла гумна.

Тры разы Рудзеня катэгарычна мне забараняў пры калгасніках, каб я пакінуў калгас і не з'яўляўся на работу. Прыказаў сакратарыку МТС выдаваць мне не 1,5 літра малака, а толькі па 0,5 літра ў дзень. Нарэшце ён мне заявіў, што «Памятай, я з табой расправуюся».

Рудзеня ў калгасе творыць кімала агідностей. Да калгаснікаў Рудзеня адносіцца па-чынаўніцку і ў яго добры той, хто з ім разам п'янствуе. Матка брыгадзіра Клюганоўча цэлы месяц прала Рудзені лён за тое, каб ён не складаў пратакол за парубку лесу.

Рудзеня знаходзіць сабе пагрымшае з боку старшыні Доўгаўскага сельсавета Дзямяніці і парторга сельсавета Клюгановіча.

Мае неадпрацаваныя заявы ў РК КП(б)Б, РК ЛКСМБ, палітаддзел МТС засталіся без належнага рэагавання.

МІКОЛА БАРАЙ.

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Пры праверцы на месцы факты, прыведзеныя ў пісьме тав. Барая, **пацвердзіліся.**

Старшыня калгаса Рудзеня Трахім адчыніструе, ды калгаснікаў адносіцца вельмі грубе, бярэ хабары, сістэматычна п'янствуе.

Ён акружыў сябе п'яніцамі, якія дапамагаюць яму тварыць розныя злачынствы. Весь яны загадчык старобінскага камгаса **ЛЕЎЧЭНЯ**, партарг Доўгаўскага сельсавета **КЛЯЗОВІЧ**, старшыня доўгаўскага сельсавета **ДАЎМАЦЭНЯ** і сакратар сельсавета **СЦЕШЬЦА** Рыгор. Грошы на рахунках калгаса 88, 107, 134 167 на суму 833 руб. 76 кап. затрачаны выключна на гарэлку.

Рудзеня часта збівае калгаснікаў. І жніўня гэтага года ён п'яны Бондарэ Мікалая, Хаміцевіча Мікалая і Рудзеня Аніську.

Пасля гэтага зусім не даўна, што Бондар, будучы адначасоўцам, падаў заяву не ў калгас «**Новы свет**», на тэрыторыі якога ён пражывае, а ў калгас «**Пяцідодка**».

За як-такога-ж і дзе фактычны рост калгаса? Рудзеня прыняў у калгас замоніка Хаміцевіча, Нядзельку Ігната, які ўсю зіму карміў кароў Рудзені, даў яму авечку; разам з ім п'янствуе.

Злачынствам у калгасе няма канца. 700 пудоў бульбы і 100 пудоў проса для разлаўы калгаснікам згніло, разбазарана 800 літраў чалавек. Справа аб гэтым была змазана і толькі ў пачатку гэтага года былі разлічаны калгаснікі за 1933 год.

Рудзеня выжыў з калгаса рахункавода, — комсамольскага арганізатара, ды ўзгнаў селькора-рэдакцыі Барая, які на працягу ўсяго часу выкрываў злачынныя дзянні старшыні Рудзені. Не раз Рудзеня Трахім выкідваў Барая з кацэлярыі калгаса, прыказваючы: «Не будзеш больш аба мне пісаць, вон з калгаса».

Аб усіх гэтых злоўжываннях Барай напісаў допіс у РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ, дзе справу гэту змазалі.

Праследаванні і гнецені на Барая, як на селькора, пасілі досыць востры характар. Аднаго разу, напіўшыся, Рудзеня Трахім нехаўлі раз стрэліў на ім з нагана. Наогул самачынствы з яго боку даходзяць да крайнасці. Часта ён прыходзіць на канцэрт п'яным, пачынае лаяцца з конюхамі і ў канцэрце адарвае стральбу.

Райпрамурор Гіскін не прыклаў ніякага значэння і не палічыў патрэбным заводзіць справу аб замаху з боку старшыні калгаса Рудзені на селькора Барая. Гіскін адкрыта заявіў, што «калі гэтае жыцьцё, дык нічога».

Рудзеня Трахім мае добрых апекуноў усюды як у сель-совеце, так і ў раённых арганізацыях, якія абараняюць яго злачынныя дзянні. Для прыкладу прыводзім характэрнае пісьмо, якое піша яму адзін з раённых работнікаў. «Добры дзень тав. Рудзеня! У першых стрэлах свайго кароценькага пісьма паведамляю, дарагі таварыш, што я жыву ў Старобіне благаталучна, але ўсё-такі ўспамінаюцца тыя дні, як мы праводзілі а табой і хацелася-б яшчэ правесці хоць адзін вечар таварыскай дружбы. (чытай п'янкі, рэд.). Адносна твайго супрацаўніка Барая, райком комсамола рашыў адазваць. І на той пруце, якая сабралася супроць цябе рашыў моцна стукнуць і ты тав. Рудзеня, пэўна трымайся і тады перамога заўсёды будзе на тваім баку. З прывітаннем А. Дзядзюль».

Вось чаму ён так упэўнена гаворыць: «Рукі кароткія ў вас, каб зняць мяне з працы».

Шматлікія заявы і скаргі калгаснікаў селькораў у райком КП(б)Б, райгазету і іншыя раённыя арганізацыі аб злачынствах у калгасе «Новы свет» засталіся без ніякага рэагавання. Асабліва ў гэтых адносінах славіцца раённы пракурор ГІСКІН. Ён свядома ўпрыгожыў дзесяткі скарг сумленных калгаснікаў і селькораў.

МІНДАЛЬ.

ПІСЬМЫ рабочых і калгаснікаў

ПРАКУРОРУ РЭСПУБЛІКІ тав. КУЗЬМІНУ.

АБУРАЮЧАЯ БЕЗГАСПАД РЧАСЦЬ

(Пісьмо члена КП(б)Б)

У 6 кілометрах ад цэнтра раёна — Камарына размешчан калгас «**Чырвоны квіт**». Гэтаму калгасу раённыя арганізацыі не аддаюць ніякай увагі.

У калгасе ёсць шкоднічтва, якое праходзіць міма вушэй кіраўніцтва раёна. 16 вазоў калашы ляжыць доўгі час на полі і ніхто не думае ўбраць.

Калгаснікі на работу не выходзяць. Тэхнічная апрацоўка ільну зрываецца, таму калгас не выканаў план.

У калгасе пагніло і прарасло 100 коп збожжа. Абмалацілі 50 коп збожжа, якое пралежала нязеяным больш месяца і прарасло.

На полі і вараз знаходзіцца 6 сцірт аўса і тры сцірты грэчкі. Ахова калгаснай маемасці адсутнічае, таму з 6 сцірт аўса засталося толькі 4. З 13 жаўцоў бульбы засталося 11.

Калгас нажаў 20 коп проса, палова яго прарасла і астатнюю частку расцягалі.

Калгас зэмечаны класава-чужымі элементамі. Адказны за бульбу працуе пакулачнік Грошько Рыгор, адказным за малацьбу — шкоднік Койдан.

Старшыня калгаса Каропкал не цікавіцца работай.

ЦЕРАХАЎ.

НАРКОМУ АСВЕТЫ тав. ЧАРНУШЭВІЧУ

ГАВАРЫЛІ, ПАСТАНАЎЛЯЛІ І ...ЗАБЫЛІ

(Пісьмо настаўн'ка)

У часе асенняй канферэнцыі настаўнікаў Парыцкага раёна многа гаварылі аб завочным навучанні настаўнікаў. Тут-жа на канферэнцыі былі раздаены анкеты, заявы для запаўнення настаўнікам, паступаючым на завочную вучобу. Анкеты былі запоўнены і зверпуты назад.

Настаўнікі былі прымацованы да рагачоўскага беднетэхнікума. Але даўжэйшы. Пастановы засталіся толькі на паперы.

Па Чырвоўскаму сельсавету ёсць 8 настаўнікаў, якія жадаюць вучыцца завочна, напаўняць свае веды. Прайшло ўжо тры месяцы, а ніхто з рагачоўскага беднетэхнікума заданняў не прысылае і ніякай сувязі з настаўнікамі не вядзе.

Такое-ж становішча і на іншых сельсаветах Парыцкага раёна.

Г. М. ГОВІКАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ. «ЗВЯЗДА», звяртаючы ўвагу наркома асветы тав. ЧАРНУШЭВІЧА і патрабуе неадкладнага прыняцця наленных мер да зрыўшчыкаў заочнага навучання.

ЧВА УПАЎНАВАЖАНАГА КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ ПА БССР тав. КАМЕНЕВУ.

ІГНАРУЮЦЬ РАБОЧЫ КАНТРОЛЬ

(Пісьмо рабочага)

Загатчык сталовай цагельнага завода пры **віцебскай фабрычна-працоўнай калоніі Гофман** і буфетчыца **Харунная** робяць розныя злоўжыванні.

Так, пры выдачы рабочым хлеба заўсёды недаважваюць па 30-40 грамаў. Хлеб, які атрымліваецца з фонда цэнтралізаванага снабжэння, пад шлам камерцыйнага прадаюць па 1 руб. 50 кап. кілограм.

З мэтай поўнага выяўлення вінаватых у гэтым, група масавага рабочага кантролю раніцы правесці праверку работы сталовай. Але дырэктар завода **Каган** і загатчык сталовай **Гохман** брыгаду не дапусцілі да праверкі. Яны заявяваюць, што «рабочы кантроль не мае права правяраць грашовыя дакументы».

ФІЛОНЧЫК.

САКРАТАРУ БЫХАЎСКАГА РК КП(б)Б т. РЭЗНІКАВУ

БЫХАЎСКІ РАЙЗА ПАТУРАЕ ЗЛАЧЫНЦАМ

(Пісьмо сельсра)

Злачынстваў у калгасе «**Фарэйн**», Чыгірынскага сельсавета (Быхаўскі раён) не мала. Недаўна згарэў ад падпалу стог калгаснага сена.

Конскае пагалоўе не ў парадку. З-за дрэнных адносін калгаснікаў Зськіна і Пярлова калгасная кабыла абарціравала. Да рэчы, **Зськін Л.** да 1931 г. быў пазбаўлен выбарчых праў.

Аб гэтым своечасова было паведамлена раёна. Але праходзіць ужо больш двух месяцаў і ніякага адказу.

Калгаснікі з абурэннем чакаюць, калі злачынцы будуць прыцягнуты да адказнасці.

АНТОНАЎ ВАСІЛЬ.

Па слядах пісем

Зрываецца будаўніцтва вучэбнага камбіната сувязі

Пад тэзісам загалоўкам «Звязда» ад 26 лістапада змясціла пісьмо тав. Шарава. У пісьме ўказвалася, што на пабудове вучэбнага камбіната сувязі ніякая культурна-масавая работы сярод рабочых не праводзіцца. Соцспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута.

Няма планавасці ў рабоце. Начальнік работ Пятокін і прораб Дзержаўнаў не маюць календарнага плана работы. Нарады рабочым не выдаюцца. Рабочыя па два месяцы не атрымліваюць заработку.

Беларускае кіраўніцтва сувязі паведамляе, што факты пацвердзіліся.

За вядбайныя адносіны да працы начальник работ Пачокін з працы знят.

АД РЭДАКЦЫІ. «ЗВЯЗДА» лічыць, што гэты адказ з'яўляецца далёка не вычэрпваючым усе факты, указаныя ў пісьме т. Шарава.

Знящем з работы начальніка работ Пачокіна справа не палепшылася. У рэдакцыю паступіла другое пісьмо, у якім указваецца, што на сёнешні дзень яшчэ не закончана паравое апаленне, а плачэй таксама няма. Далей у такіх умовах працаваць студэнтам немагчыма.

Рэдакцыя патрабуе ад упаўнаважанага Наркомсувязі тав. ВАЛОДЗЬКА гласнага і гэрмінованага адказу па пісьму т. Шарава.

ЗНОЎ „СТАНДАРТНАЕ" МЕНЮ

Безгаспадарчасць, антысанітарыя пануюць у сталовай ЗСК БДУ № 69 (па Комсамольскай вуліцы). Брудна на кухні, брудна і ў абедзенай зале.

Абеды, як кажуць студэнты, «стандартныя». Калі капуста, дык усё меню стрэнаціць ёю, калі бручка, дык на першае і другое. Беспрытульныя абыходзяць сталы і хаваюць таперкі і хлеб з рук студэнтаў.

4 ПОДПІСЫ.

У ДАПАМОГУ КІРАЎНІКУ ГУРТКО І МАСАВАГА ЧЫТАННЯ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

„ПАДНЯТАЯ ЦАЛІНА" М. ШОЛАХАВА

У рамане **М. Шолахава «Паднятая цаліна»** паказваецца класавая барацьба ў алтыным з казацкіх хутароў Дона ў часе барацьбы за суцэльную калектывізацыю. Змест рамана такі. Да кулака Якава Астраўнова прыязджае сакрэт Полаўцаў. У гэты ж час у хутар райкомам партыі накіроўваецца дваццацапяцітысячнік, рабочы путыліўскага завода Давыдаў. Пачынаецца барацьба за калектывізацыю.

Сход бедноты выказваецца за калектывізацыю і запатрэбуе спіс кулакоў на раскулачванне. Праводзіцца раскулачванне і арганізуецца калгас, у які ўступае кулак Астраўнов і пачынае весці падрыўную работу. Ён агітуе серадняцкую супроць уступлення ў калгас і намацвае глебу для арганізацыі ў хутары контрэвалюцыйнага саюза роднага Дона. Сакратар хутарскай ячэйкі Нагульнов робіць ліквідацыю перагібаў у абазначэнні ўсёй жывёлы і хатняй птушкі. У хутары разгортваецца агітацыя кулацкіх элементаў, якія асталіся пасля раскулачвання. Усё гэта прыводзіць да таго, што на хутары пачынаюць рэзаць жывёлу.

Актыўна Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў» стварыў рэзкі пералом у разгортванні калектывізацыі. Нават казакі, якія ўступілі ў «саюз» для барацьбы супроць совецкай улады, зразумелі, што яны памыляліся. Саюз распадаецца. На падпольным сходзе «саюза» есаул Полаўцаў прымушаны далей рэзкі аднор: «Мы ж супроць совецкай улады, а супроць сваіх хутарскіх непаладзіў, а вы яе хацелі заварушць супроць совецкай улады». Пачынае не ўдалося. Полаўцаў і Липеўскі (такі ж былы афіцэр, які прыехаў у хутар нядаўна) пакалі. Але астатні стар-шыны ішчэ мошны. Бабы ўмацоўваюць бунт і абвяшчаюць Давыдаў. Гэты бунт быў добрым урокам і для цэнтральнай арганізацыі хутара і для сяміх калгаснікаў. Пасля усіх гэтых падзей намецца пералом. Сярэдні калгас стаў наладжацца, і Давыдаў ня бяцца захапіўся калгаснымі справамі. Але, не гледзячы на тое, што ён пакінуў, што як ён, цэнтрам захапіўся калгаснымі справамі, ён думаў зусім іншае: «Пачакаем яшчэ, што яно будзе далей. Цяпер не давялося развіцца з совецкай уладай — можа яшчэ больш надзейная справа зачнецца». Дзве галоўныя сілы сустрэліся на сацыялістычных палях: прадстаўнік індустрыяльнага пролетарыята (Давыдаў), якога падтрымлівае асноўная маса бяднякоў - серадняцкай часткі казакаў і кулацтва (Астраўноў), якая ідзе, але не адвецца, аказвае шалёнае супраціўленне.

М. ШОЛАХАЎ

Давыдаў правільна разумее палітыку партыі на вёсцы. Ён найбольш дакладна ўлічвае абставіны, у якіх даводзіцца яму працаваць. Ён па-большэвіцку на справе змяняецца за генеральную лінію партыі. Ён адразу зразумеў, што ў раёне ёсць апартуніям, і не замазвае гэтага, а проста гаворыць сакратару райкома: «Ты ўмаіт такое мне кажаў вазмі, ён думаў зусім іншае: «Пачакаем яшчэ, што яно будзе далей. Цяпер не давялося развіцца з совецкай уладай — можа яшчэ больш надзейная справа зачнецца». Дзве галоўныя сілы сустрэліся на сацыялістычных палях: прадстаўнік індустрыяльнага пролетарыята (Давыдаў), якога падтрымлівае асноўная маса бяднякоў - серадняцкай часткі казакаў і кулацтва (Астраўноў), якая ідзе, але не адвецца, аказвае шалёнае супраціўленне.

Шолахаў паказвае, што асноўнае ў барацьбе — гэта людзі, якія будуць сацыялізм і што трэба больш увагі аддаваць кожнаму чалавеку, больш класавай пільнасці. Ён у мастацкай форме раскрывае асноўныя труднасці, якія стаяць перад намі на шляху сацыялістычнай пераробкі сельскай гаспадаркі. Партыйцу-пісьменнік паказвае глыбока, праўдзіва, як жывых людзей, у якіх ёсць не толькі станоўчыя, але і адмоўныя рысы.

Ярка паказвае пісьменнік класавых ворагаў. Перад намі праходзіць цэлы рад кулакоў — актыўных ворагаў совецкай улады: Астраўноў, Шчыток, Фежар, Рвалы, Лапшынаў і інш.

Астраўноў — адзін з найбольш яркіх тыпаў класавага ворага. Гэта кулак, які дзейнічае «ціхай сапай». Ён уступае ў калгас, каб разваліць яго. На сходзе калгаснікаў ён за калгас, а выпаўшы са схода, ён спрод «надзейных» сераднякоў праводзіць работу супроць калгаса. Астраўноў хітры і небяспечны вораг.

М. Шолахаў паказвае тры тыпы сераднякоў, якія хістаюцца: Кузьму, Мікалая Мошню і Ахваткіна. **Кузьма** не супроць калгаса, ён нават за, але за калгасы, якія-б арганізаваліся з роўных па маемасці людзей. Ён так і кажа: «Людзей трэба дабраць, як добры гаспадар быкоў. Ім, ён-та быкоў дабірае роўных па сіле, росце. А запраўдэ розных, што яно атрымаецца? Які мацней—будзе заламваць, слабы стане, а праз яго і мочыму, бясспрэчна, трэба станавіцца. Якая-ж з іх работа?»

Трое беднякоў казакаў: Хапроў, Алаўмянчук і Кулачкін. Бярэчоў — перайшлі на бок класавага ворага. Гістэрыка з Хапровым заклікае нас да таго, каб мы больш увагі ў адносінах да аднаасобніка. Каб у свой час узялі за Хапрова і ўгрэлі яго ў выказаўную працу, не было-б трагічнай яго гібелі, і інш., якія звязвалі Астраўнова з афіцэрствам і раскулачанымі, выкрылі-б своечасова.

Значэнне рамана ў тым, што ён не толькі расказвае пра падзеі, якія надоўга былі, а ўзбройвае на барацьбу з апошнімі астаткамі класавых ворагаў на вёсцы, дасягнуты ў адкрытым бай. У рамане ўскрываюцца асноўныя труднасці, якія стаяць на шляху будаўніцтва сацыялізма на вёсцы, новыя метады барацьбы класавага ворага. Раман паказвае, як перамагаць гэтыя труднасці. Аўтар заражае чытача энтузіязмам, дае ўпэўненасць у пераможным поступе сялянскіх мас да сацыялізма.

П. КІСЕЛЕЎ.

МЕТАДЫЧНЫЯ ЗАЎВАГІ

Пры распрацоўцы «Паднятай цаліны» раім звярнуць увагу слухачоў на наступнае.

1. М. Шолахаў паказвае ў кнізе два этапы ў калектывізацыі. Першы этап — да з'яўлення і момант з'яўлення артыкула т. Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў», і другі этап, калі класавы вораг перайшоў ад адкрытай барацьбы да так званага шкоднічства «ціхай сапай». Тут важна падкрэсліць рэзкі пералом у калектывізацыі са з'яўленнем артыкула, таварыша Сталіна, калі значная частка сераднякоў, якія ўступілі ў «саюз вызвалення роднага Дона», пакінулі яго, пераканаўшыся, што перагібы прадпісаваны не совецкім урадам, а мясцовымі ўладамі.

Не менш важна і актуальна паказаць новыя метады дзейнасці класавага ворага. Такім заканчэннем тыпам перакопанага класавага ворага з'яўляўся Астраўноў. Ён згодзен «лепш выкінуць авечкі тушы... чорнаму кобелю, чым пусціць авечак у калгасны гурт, каб яны тлусцелі і плазілі на прокорм варожай улады».

2. Асноўны герой рамана Давыдаў, не пазбаўлены таксама некаторых адмоўных рысаў, падае Шолахавым як сапраўдны большэвік, правільна разумеючы генеральную лінію партыі, практычна праводзіць пролетарскага ўдару на вёсцы. На прыкладзе Разметнага, Нагульнага, Давыдава і інш. варта паказаць слухачам, што асноўнае ў барацьбе за социялізм рашаюць людзі, весь чаму трэба правяліць больш чуласці да кожнага чалавека, больш класавай пільнасці і дбайнасці.

3. На прыкладзе Кандрата Майданікава паказаць, як у працэсе калектывізацыі селяніна уседамляе перавагу калгаснай сістэмы перад аднаасобнай. Трэба падкрэсліць, што адным фактам уступлення ў калгас селянін яшчэ не перавыхоўваецца, што гэта наступае толькі ў працэсе барацьбы за большэвіцкія калгасы.

Дзяржаўная бібліятэка і бібліяграфічны інстытут БССР імя Леніна

БІБЛІЯГРАФІЯ М. А. ШОЛАХАВА

Міхаіл Александравіч ШОЛАХАЎ нарадзіўся ў 1905 годзе на хутары Кружылінскім, на Дану. Шолахаў скончыў 4 класы Богучарскай мужчынскай гімназіі. Пасля работы ў выканкоме Каргінскай станіцы — справаводам, з 1921 па 1923 год працуе харчовым інспектарам. У 1923 годзе Міхаіл Александравіч едзе ў Маскву. Некаторы час быў беспрацоўным, працаваў грузчыкам, чорнарабочым, каменшчыкам, рахункаводам.

Шолахаў—член ВКП(б) з 1932 года. Пачаў друкавацца з 1923 года. Працаваў фельетыністам у комсамольскай газеце «Юношеская правда». Пасля выдання кнігі «Донские рассказы» перайшоў палкам да пісьменніцкай працы. Ён — актыўны член Вешанскай партыйнай арганізацыі. Ён моцна звязан з калгасамі, яго доме можна кожны дзень бачыць калгаснікаў, якія прыходзяць на розных нарадах да пісьменніка-большэвіка.

— Я бываю ў калгасе часта, гаворыць сам Шолахаў.

— Без гэтай сувязі я не мог-бы пісаць.

Міхаіл Шолахаў—член рэдкалегіі калгасаў.

Пачаў друкаваць з 1923 года. Спачатку — фельетыністам у комсамольскай газеце «Юношеская правда». Пасля выдання кнігі «Донские рассказы» перайшоў палкам да пісьменніцкай працы. Ён — актыўны член Вешанскай партыйнай арганізацыі. Ён моцна звязан з калгасамі, яго доме можна кожны дзень бачыць калгаснікаў, якія прыходзяць на розных нарадах да пісьменніка-большэвіка.

— Я бываю ў калгасе часта, гаворыць сам Шолахаў.

— Без гэтай сувязі я не мог-бы пісаць.

Міхаіл Шолахаў—член рэдкалегіі калгасаў.

некалькіх маскоўскіх журналаў. Ён вядзе вялікую работу з маладымі пісьменнікамі, ён шефствуе над пяцю пачынаючымі пісьменнікамі, правіць іх рукапісы, дапамагае сваім вопытам і ведамі.

Шолахаў з'яўляецца адным з найбольш яркіх і таленавітых пролетарскіх совецкіх пісьменнікаў сучаснасці.

Творчасць Шолахава прысвечана паказу Паўночнага Каўказа і быту данскога казацтва.

Тэмы яго твораў заўсёды актуальныя, вобразы і мова высокамастацкія.

Што чытаць у Шолахава

«Лазоревая степь», Москва, Моск. т-во писателей. 1931 г. 232 стр., Ц. 2 р. 30 к. Пер. 30 к.

Тэматыка зборніка—паказ казацтва эпохі грамадзянскай вайны. Апавяданні рыхуць класавае расслаенне казацтва ў часы грамадзянскай вайны, жорсткую крыжаўную барацьбу кулакоў з рэвалюцыйнымі пралетаўнікамі вёскі. Глыбока сацыяльна насычаны апавяданні: «Пастух», «Смертный враг», «Червоточина» і інш.

«Тихий Дон». Кн. 1.— М. Л. ГИЗ. 1929 г. 383 стр.: Ц. 60 к. п. 15; кн. II. III выд. М. Л. ОГИЗ. 1931 г.

Раман ахапляе падзеі 1912-1919 гг. Ён мае тры часткі. Першая кніга знаёміць чытача з бытам, абычаямі і абставінамі жыцця дарэвалюцыйнага казацтва. Другая—дае паказ імперыялістычнай вайны і першых дзён рэвалюцыі. Трэцяя кніга паказвае класавае расслаенне казацтва, партызанскі рух, грамадзянскую вайну і паўстанне контрэвалюцыйнай часткі казацтва супроць совецкай улады ў гады грамадзянскай вайны на Дану.

«Паднятая цаліна». Менск, ДБВ. 1934 г. 304 стр. Ц. 2 р. 70 к., пер. 30 к.

Належыць да буйных твораў сучаснай совецкай літаратуры.

«Паднятая цаліна»—раман аб калектывізацыі на Паўночным Каўказе ва ўмовах адной станіцы Данска-серадняцкай мас казацтва да

За рубяжом

ПАЎСТАННЕ КАВАЛЕРЫЙСКІХ ЧАСЦЕЙ У МАНЧЖУРЫІ

ТОКІО, 15 снежня. (БЕЛТА). Кавалерыйскія часці, якія складаюцца галоўным чынам з манголаў і размешчаныя ў ПЯНЬЦЗЯДЗЯНЕ на ўсход ад Тунляо (Хінганская правінцыя Манчжурыя), 13 снежня паўсталі і, згодна паведамлення мукдэнскага карэспандэнта газеты «Ніці-Ніці», арыштавалі ўсіх японскіх і кітайскіх афіцэраў мясцовага манчжурскага гарнізона.

Атрад паўстаўшых 13 снежня выйшаў з Пяньцзядзяна з мэтай заняць Тунляо. Насустрач атраду паў станцыю з Тунляо выслана японскія войскі на бронеаўтамабілях. Згодна папярэдніх даных, у Пяньцзядзяне цяжка ранены паўстанцамі два сідныя японскія рэзідэнты.

АНГЛА-ЯПОНСКІЯ СУПЯРЭЧНАСЦІ У МАНЧЖОУ-ГО

ТОКІО, 15 снежня. (БЕЛТА). Газеты паведамляюць, што англійскі пасол у Японіі Клайв 14 снежня наведаў Хірота (японскі міністр замежных спраў) і прасіў адказу японскага ўрада на ноту пратэсту англійскага ўрада супроць увядзення нафтавай манаполіі ў Манчжоу-Го, уручаную Хірота 24 лістапада.

Хірота, — піша агенцтва, — у сваім адказе растлумачыў, што «нафтавая палітыка Манчжоу-Го грунтуецца на кантролі над прамысловасцю і не звязана з нафтавай палітыкай Японіі. Такім чынам, Японія не мае нічога агульнага з нафтавай палітыкай Манчжоу-Го і, значыць, не можа весці перагавораў па гэтаму пытанню з замежнымі дзяржавамі. Адная ля зручнасці японскі ўрад перадаў манчжурскаму ўраду англійскі пратэст і як толькі атрымае адказ, перашле яго Англіі».

АБВАСТРЭННЕ ІТАЛА-АБІСІНСКАГА КАНФЛІКТА

ЛОНДАН, 15 снежня. (БЕЛТА). Згодна вестак «Івнінг старт», італа-абісінскі канфлікт набывае сур'ёзны характар. Газета паведамляе, што ў Абісінію павінны прыбыць японскія ваенныя эксперты для абучэння абісінскіх войск.

Гэта, паводле слоў газеты, можа яшчэ больш абвастрыць адносіны паміж Італіяй і Абісініяй. Да гэтага часу абучэнне абісінскіх войск праводзілася бельгійскай ваеннай місіяй, «супроць чаго Італія таксама пярэчыла».

Карэспандэнт «Дэйлі мейль» паведамляе з Адыс-Абебы, што згодна сцвярджэнню абісінскага ўрада, італьянскія самалёты бамбардыравалі 8 снежня мясцовасць Адо пасля ад'езду англа-абісінскай пагранічнай камісіі. Абісінскі ўрад указвае таксама, што італьянскія самалёты прадаўжаюць рабіць разведку на абісінскай тэрыторыі.

АНГЛА-СОВЕЦКІЯ ГАНДЛЁВЫЯ АДНОСІНЫ

ЛОНДАН, 15 снежня. (БЕЛТА). Рэдактар эканамічнага аддзела «Дэйлі геральд» Вільямс падрабязна абмяркоўвае пытанне аб палепшэнні метадаў фінансавання англа-совецкага гандлю.

Вільямс высоўвае тры прапановы: 1) прадастаўленне СССР доўгатэрміновай пазыкі; 2) прадастаўленне СССР істотных гандлёвых крэдытаў; 3) зніжэнне цяперашніх высокіх процантных ставаж. Процанты за крэдыты, прадастаўляемыя совецкім гандлёвым арганізацыям, з'яўляюцца паводле слоў Вільямса, занадта высокімі.

Выпуск доўгатэрміновай пазыкі — прадаўжае Вільямс — быў-бы найлепшым метадам распырэння гандлю з СССР. Калі-ж гэта не можа быць зроблена, то совецкім гандлёвым арганізацыям павінны быць адкрыты банкаўскія крэдыты. Вядома, такія крэдыты павінны былі быць прадастаўлены на даволі доўгі тэрмін — да 5 год. з тым, каб такім шляхам сапраўды можна было павялічыць совецкія заказы на прамысловае абсталяванне.

РАЗГУЛ ФАШЫСКАЙ РЭАКЦЫІ У ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 15 снежня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення барселонскай газеты «Дзіліовіо», у сувязі з адкаўленнем работ на шахтах у Астурыі, у Овіедо прыбылі з Мадрыда 4 спецыяльныя паліцэйскія брыгады. Ім даручана сабраць адпячаткі пальцаў ва ўсіх гарнякоў у раёне Овіедо. Адпячаткі будуць сабраны ў картатэку разам з іншымі весткамі аб кожным шахцёры.

«Трэба адзначыць — піша «Дзіліовіо» — што палітычна ненадзейныя рабочыя адмовіліся з'явіцца на шахты, заляўшы, што яны не адновяць работы да таго часу, пакуль не будуць адменены ўведзеныя нядаўна пасведчанні аб палітычнай надзейнасці.

Аднавілі работу толькі рабочыя брыгады па абслугоўванню шахт.

З Мадрыда паведамляюць, што ўчора парламент прыняў рашэнне аб увядзенні ў Каталоніі так званага часовага рэжыму. Тэрмін гэтага часовага рэжыму не ўстаноўлен. Фактычна гэта рашэнне азначае скасаванне каталонскай аўтаноміі, якая з'яўляецца адным з асноўных завалаванняў рэвалюцыі 1931 года.

Наглая антысовецкая фальшыўка

ПАРЫЖ, 15 снежня. (БЕЛТА). Фашысты паладзілі ў Саарбрукене выстаўку пад назвай «Барацьба за бога». Аб характары выстаўкі дастаткова гаворыць тое, што на ёй фігуруе «совецкі дэкрэт аб напыналізацыі жанчын». Рад рабочых арганізацый накіраваў ва ўрадавую камісію Саарскай вобласці пратэст дзесяткаў тысяч рабочых супроць гэтай антысовецкай фальшыўкі.

Па Совецкай Беларусі

РАЕНЫЯ З'ЕЗДЫ САВЕТАЎ

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону).

15 снежня ва ўрачыстай абстаноўцы адкрыўся VII раённы з'езд советаў. На з'езде прысутнічалі 534 дэлегаты.

З'езд з вялікім уздымам сустрэў паведамленне, што магілеўская прамысловасць датэрмінова выканала гадавы план і здае звыш плана прадукцыі на 6 мільёнаў рублёў.

***

ПОЛАЦК, 15. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

На з'езд советаў прыбыла 357 дэлегатаў з 401. З дакладам аб рабоце ўрада БССР за перыяд ад X да XI з'езда советаў БССР выступіў наркамзем БССР т. **БЕНЕК.**

З'езд віталі рабочыя хлебазавода, прадстаўнікі гарнізона і знатныя людзі Полацкай МТС.

***

КРЫЧАЎ. (Па тэлефону)

9 дэлегатаў раённага з'езда советаў падалі заявы ў РК аб прыёме іх у спачуваючыя.

З'езд паслаў у Кармянскі раён брыгаду з 5 чалавек у дапамогу ільнозагатоўкам.

Па прапанове дэлегатаў арганізован збор сродкаў на эскадрыллю імя тав. Кірава. Сабрана 1000 р.

БАБРУЙСК. (Па тэлефону).

Адкрыўся раённы з'езд советаў. Прыбыла 480 дэлегатаў. З дакладам ўрада выступіў народны камісар фінансаў тав. **Хацкевіч.**

ВЫПУСК ВЫШЭЙШАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ С.-Г. ШКОЛЫ ІМЯ ЛЕНІНА

30 снежня адбудзецца выпуск Вышэйшай комуністычнай сельска-гаспадарчай школы БССР імя **Леніна.**

Пасля трохгадовага навучання будзе выпушчана 109 кваліфікаваных арганізатараў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Большасць выпускаемых студэнтаў (59 чалавек) будзе накіравана для работы ў калгасах у якасці парторгаў і старшынь калгасаў і загадчыкаў ферм. 19 чалавек будуць накіраваны для работы ў соўгасах у якасці дырэктароў і іх намеснікаў.

(БЕЛТА).

СІЛІКАТНЫ ЗАВОД ПЕРАД ПУСКАМ

У Оршы ў апошнім закончана пабудова сілікатнага завода. Пуск яго намечан у канцы снежня. Завод будзе выпускаць 11 млн. агнетрывалых цаглін у год. У 1935 годзе ён дасць звыш 5 млн. цаглін. Агульны кошт будаўніцтва і абсталявання завода звыш 1 мільёна рублёў.

ВЫПУСК ІНЖЫНЕРАЎ ЛЕСАЭКСПЛААТАЦЫІ І МЕХАНІЧНАЙ АПРАЦОЎКІ ДРАЎНІНЫ

У Гомелі адбыўся чарговы выпуск Беларускага лесатэхнічнага інстытута. Выпушчаны 53 інжынеры па лесаэксплаатацыі і механічнай апрацоўцы драўніны. Сярод вы пускнікоў — членаў КП(б)Б і ЛКСМБ 78 проц., рабочых—67 проц.

К 1 студзеня 1935 г. Белшвейаб'яднанне прыступіла да шыцця экспанатаў па заданнях горсана, якія будуць прадстаўлены для адбору і зацверджання адзінага вучнёўскага гарнітура.

На здымку: узоры мадэляй вучнёўскай формы.

У СОЎНАРКОМЕ БССР

* СНК БССР адпусціў 30.000 руб. на абсталяванне нова-пабудаванага асвейскага дома сацыялістычнай культуры.

* За перавыкананне плана III квартала па колькасных і якасных паказальніках віцебскі фанерны завод прэміраван 8.000 руб. і фанерны завод імя Томскага — 1.000 руб. Дырэктар віцебскага фанернага завода тав. Мальчык прэміраван 400 рублямі.

* Для бесперабойнага снабжэння печаным хлебам рабочых і служачых прадпрыемстваў Белгалоўспірта, СНК БССР пастанавіў пабудаваць пры 25-ці вінакурных заводах хлебапякарні. Будаўніцтва павінна быць закончана не пазней 1 студзеня 1935 года.

ФІЗКУЛЬТУРА Ў КАЛГАСАХ

У калгасах Беларусі арганізуецца 50 каткоў. Першыя каткі пачалі ўжо працаваць у некаторых калгасах Гомельскага і Віцебскага раёнаў. У вёску адпраўлена 3.000 пар лыжаў і 1.000 пар канькоў.

Для абслугоўвання калгаснікаў фізкультурнікаў ужо арганізавана 20 перасоўных лыжных баз. Кожная база мае 10 пар лыж і 5 пар канькоў з бацінкамі.

У раёнах будуць праведзены дэкадныя курсы па падрыхтоўцы для калгасаў фізкультурных арганізатараў па зімовых відах спорту. Курсы падрыхтуюць 600 чалавек. У студзені пачнуцца калгасна-совгасныя спартакіяды па лыжах і канках.

ШАХМАТНЫ ТУРНІР ЧЭМПІЁНАЎ СССР

Сёмы тур 15 снежня

ЛЕНІНГРАД.

Выйгралі: Рабіновіч у Савіцкага, Чэхавер у Лісіцына, Багатырчук у Фрэймана і Мазель у Ільіна-Жэнеўскага. Закончылі партыі ўнічыю: Алагарцаў—Левінфіш, Юдовіч—Дубінін, Рагозін—Панаў і Белавенец—Макагонаў. Незакончаны партыі: Кан—Раузер з шаткамі на выйгрыш у Кана і Верасаў—Румін у заблытаным становішчы.

Становішча пасля сёмага тура

Багатырчук і Алатарцаў—па плюс 5; Белавенец — плюс 4,5; Левенфіш і Кан—па плюс 4 з 6-ці: Дубінін, Чэхавер, Юдовіч, Рагозін, Мазель—па плюс 4; Рабіновіч—плюс 3,5 з 6-ці і Макагонаў плюс 3,5 з 7

ТАВ. КАГАНОВІЧ — ГАНАРОВЫ ЧЛЕН ГОМЕЛЬСКАГА ГОРСОВЕТА

На перавыбарным сходзе рабочых Сельмаша ганаровым членам Гомельскага гарадскога совета выбран тав. Л. М. Кагановіч.

МУЗЫЧНЫЯ ТВОРЫ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ ТАВ. КІРАВУ

Кампазітары БССР напісалі рад твораў, прысвечаных памяці Сергея Міронавіча Кірава. Кампазітары Любан і Цікоцкі напісалі жалобны марш для сімфанічнага аркестра. Аладаў — трыо для скрыпкі, віяланчэлі і фортэпіяна.

На словы Алеся Дудара «На магілу Кірава» Тараўскі напісаў харавую музыку, а Іваноў—спеў з фортэпіяна. Кампазітар Туранкоў напісаў жалобны фрагмент для валторны з фортэпіяна і жалобную элегію «Вернаму салдату рэволюцыі». Кампазітар Багатыроў напісаў прэлюдыю для фортэпіяна пад назвай «Светлай памяці Сергея Міронавіча».

Усе творы падрыхтаваны да друку. (БЕЛТА).

НОВАЯ ХЛЕБАПЯКАРНЯ Ў СЛУЦКУ

СНК БССР пастанавіў пабудаваць у Слуцку адну новую хлебапякарню на 4 печы магутнасцю ў 12 тон у суткі. Для гэтай мэты асігнавана 50.000 руб.

Белкаапсаюзу і Слуцкаму райвыканкому прапанавана неадкладна прыступіць да будаўніцтва пякарні з тым, каб скончыць яе да 15 студзеня.

ХРОНІКА

* **800 ПРАМЫСЛОВЫХ АРЦЕЛЕЙ** налічваецца ў БССР. У гэтым годзе арцелі асвоілі рад новых выгворчасцей: арганізован масавы выпуск розных цацак, лямпавых кнотаў, гліняна-дымгарных труб, элек трапатэфонаў і т. д.

* **РАЕННАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ НАСЕННАЯ ІНСПЕКЦЫЯ** арганізавана пры земаддзеле Менскага РВК.

* **СТРУННЫ АРКЕСТР** арганізован рабочымі-будаўнікамі аўтаэмзавода ў Магілеве. Аркестр выдзелен для ўдзелу ва ўсебеларускай алімпіядзе самадзейнага мастацтва.

* **1.040 МАЙСТРОЎ** — лабарантаў, прыёмшчыкаў для масласлёзаводаў будзе падрыхтавана на курсах Белкаапсаюза ў 1935 годзе. На гэту мэту адпушчана звыш 160.000 руб.

* **29 снежня адбудзецца выпуск гомельскага тэхнікума будматэрыялаў. Выпускніковы—46, усе па спецыяльнасці керамікі. Пасля выпуску яны будуць накіраваны на працу ў прамысловасці БССР**

АД ПАРТ АЛЕГІІ

РУСАНАЎ Апалітарый Карнавіч, год нараджэння 1904, член КП(б)Б з 1929 г. (партбілет № 1304250), служачы, з рабочых, адукацыя — сямігодка, у Чырвонай армії служыў з 1926 па 1928 г. Партспагнаннем падпадаў: ад парткома БКС атрымаў вымову за няяўку на суботнік па вырузцы збожжа. У момант узнікнення справы працаваў у Белкаапсаюзе.

Абвінавачваецца ў катэгарычнай адмове ад выказання пастановы ЦК КП(б)Б ад 2/VIII 1934 г. аб паездцы на пастаянную работу ў г. Полацк.

Справа разглядаецца па даручэнню ЦК КП(б)Б.

За грубае парушэнне партдысцыпліны тав. **Русанава**, А. К. з членаў партыі выключыць.

Сакратар парткалегіі КПК па Беларусі **ЛЕЙЗЕР.**

НАВУКА І ТЭХНІКА

Супраціўленне шкарлупы электрычнаму току

Ці можа вывесціся курэнё, калі яйкі пазбавіць ад правалы ад гарадской электрычнай сеткі і ці не будзе гета «адбівацца на тэрміне высіджвання?

Па маіх вопытах, праробленых у гэтым годзе, шкарлупа настолькі дрэнны правадніц, што яйкі ў інкубатарах спакойна высіджваюцца не толькі на правадах пад напружэннем 110 вольт (менская асвятляльная сетка), але і пры 500 і нават 1000 вольт. Курэняты, як звычайна, выходзяць з яйца на 21-шы дзень. Зразумела, неабходна да выхаду прыходзіцца выключыць ток, каб не забіць курэнё, вылезшае са шкарлупы. Змочаная шкарлупа праводзіць ток далёка лепш. Адно вільготнае яйцо было прабіта іскрой, забіўшай зародыш. Пры гэтым у шкарлупе стварылася адтуліна каля 22 міліметраў у дыяметры.

Гэты вопыт адносіцца да вывучэння дзеяння электрычнасці на жывы арганізм і яго развіццё. Ён паказвае, што не трэба перапавялічваць, таксама, як не трэба недаацэньваць ролі электрычнай сілы энергіі ў жывым арганізме. Трэба вывучаць прыроду, каб кіраваць ёю.

Праф. Л. РАЗАНАЎ.

Важнае адкрыццё хімічнага інстытута

Новы спосаб атрымання хіналінавых злучэнняў

Хімічны інстытут Беларускай акадэміі навук адкрыў упершыню ў Саюзе новы метад атрымання хіналінавых злучэнняў, якія адносяцца да класа складаных арганічных матэрый. Гэта важнае адкрыццё прадстаўляе вялікі тэарэтычны і практычны інтарэс для раду галін навукі і прамысловасці. Так, моцнае фізіалагічнае дзеянне хініна і іншых антымалярыйных прэпаратаў абумоўлена галоўным чынам наяўнасцю ў іх азотаўтрымліваючай хіналінавай малекулы. Некаторыя з іх мяшуць пайсці ў фарбавальную прамысловасць для вырабу каштоўных красіцелей.

Новы спосаб вытаўкі адрозніваецца ад усіх іншых метадаў, якія прымяняюцца за граніцай свайёй зручнасцю і прастатой. Выходнымі прадуктамі ў новым метадзе з'яўляюцца араматычныя амины і ацэтылен, якія пад уплывам спайдзеных інстытутам каталізатараў утвараюцца каштоўная для красільнай прамысловасці матэрыял — эпідаліна.

Работа выканана навуковым работнікам інстытута Федасеевым пад кіраўніцтвам праф. Казлова.

А. І.

НОВЫЯ РАБОТЫ ІНСТЫТУТА ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Інстытут літаратуры і мастацтва Беларускай Акадэміі навук упершыню прыступае да распрацоўкі пытанняў заходне-еўрапейскай рэвалюцыйнай літаратуры.

Намечан рад мазаграфічных даследаў, прысвечаных творчасці нямецкіх паэтаў эпохі рэвалюцыі 1848 года ў Германіі Фердынанда Фрэйліграта, Георга Гервега і інш.

З гэтай серыі інстытут падрыхтаваў ужо да друку работу навуковага работніка тав. **Дворкіна** пад назвай «Фердынанд Фрэйліграт».

Рэдакцыя газеты «Совецкі юрыст» (інстытут совецкага права) уносіць на пабудову агітзвяна імя III усебеларускага з'езда рабселькораў 185 руб. Студэнты інстытута совецкага права выклікаюць на соцзнаборніцтва студкораў і студэнтаў ВПІ

В. Жамерна.

Рэдакцыя газеты палітэкдзеля соўгаса «Вайна» «За соцыялістычную свінагадоўлю» ўносіць 51 руб.

Пінскі.

Брагінская райгазета ўносіць на пабудову агітзвяна 339 руб. Усяго ўнесена 2.523 руб.

Пацярэнка.

Па гораду Чавусах паступіла 1.000 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

Л. Свяцьева.

Бялыніцкая раённая газета «Чырвоны капітэлыст» уносіць на пабудову агітзвяна 688 руб.

Шкляроўскі.

З пачатку збору ў фонд пабудовы агітзвяна імя III усебеларускага з'езда рабселькораў паступіла 47.500 руб.

ХТО ЗАТРЫМЛІВАЕ ГРОШЫ НА ПАБУДОВУ АГІТЗВЯН

Наступныя раёны зусім не перавялі пропай на бягучы рахунак Беларускага аддзялення Дзяржбанка па збору сродкаў на пабудову агітзвяна самалётаў імя 3-га Усебеларускага з'езда рабселькораў:

Любаньскі, Старобінскі, Дзяржынскі, Бягомльскі, Касцюковіцкі, Чашніцкі, Асіпавіцкі, Уздзенскі, Слуцкі, Сіроцінскі, Дрысвяцкі, Лёзненскі, Расонскі, Нараўлянскі, Асвейскі, Тураўскі, Глускі, Заслаўскі, Клічаўскі, Камарынскі, Чачэрскі, Клімавіцкі, Бярэзінскі, Крупскі, Чырвонапольскі, Церахаўскі, Ушацкі, Парыцкі, Пухавіцкі, Суражскі і Петры коўскі.

Усе сабраныя на пабудову агітзвяна грошы павінны быць перавядзены на бягучы рахунак Беларускага аддзялення Дзяржбанка № 160-10006.

ПАВЕДАМЛЕННІ

16 снежня 1934 года ў 7 гадзін вечара ў вялікай зале Дома партактыва Менгаркома КП(б)Б адбудзецца вечар, прысвечаны пятнаццацігоддзю вызвалення Украіны ад белагвардзейскіх армій Дзенікіна для партыйнага, прафесіянальнага і комсамольскага актыва.

Пасля ўрачыстага сходу—мастацкая частка.

Аддзел культуры і прапаганды Менгаркома КП(б)Б.

Сёння ў 6 гадзін вечара ў Доме партаветы адбудзецца арганізаванае Белрадыёцэнтрам, менгарана і гаркомам ЛКСМБ калектыўнае слуханне і абгаварэнне радыё-перадачы для дзяцей «Хто вінават». Пасля абгаварэння канцэрт - аматорак. Уваход вольны.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

Помещ. БДТ—I Беларускі тэатр Оперы і Балета
Тэл. 24505
Мастацкі кіраўнік І. Я. ГІТГАРЦ
17 і 18 снежня
для ударнікаў і значкістаў ЗОТ
ПІКАВАЯ ДАМА
Пач так у 8 гадз. вечара.
Заставшіяся білеты ў касе тэатра з 12—2 і з 5—8 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" | Вялікая совецкая камедыя ФЛАГ СТАДЫЁНА
Гукавы мастацкі фільм „Пролетарый" | Чатыры візіты САМУЭЛІ ВУЛЬФА
Кіно „Інтернацыянал" | Новая весёлая камедыя ПРЫЗОК
Кіно „СПАРТАК" | ЗАШТО НЕ СУДЗІЛІ (ТАМІЛА) драма ў 6 частках

Кіраўніцтва цыркавымі, эстрадныя і музычнымі прадпрыемствамі пры НКАсветы БССР
„ЦЭБ"
даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых установаў, арганізацый і асоб, што пастановай СНК БССР ад 16-XI—1934 г.
яму надана выключнае права мастацкага абслугоўвання
ўсіх пляцовак, клубаў, тэатраў, летніх садоў, паркаў і т. д. на тэрыторыі БССР, забараніўшы ўсім іншым арганізацыям займацца гэтай справай.
Кіраўніцтва ЦЭБ'а: Менск, клуб імя VII з'езда прафсаюзаў, тэлефон 22-755.
Упаўнаважаныя—ў г. г. Гомелі, Віцебску, Оршы, Бабруйску.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на 1935 год на газету ЗВЯЗДА
Орган ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—2 р. 50 к. на 3 м.—7 р. 50 к. | на 6 м.—15 р. на 1 г.—30 р.
Падпіска прымаецца: горбюро Саюздрука, агенцтвамі сувязі і газетаносцамі.
Здавайце падпіску своечасова не пазней 23 снежня і на больш доўгі тэрмін.
Памятайце, што доўгатэрміновая і своечасовая падпіска забяспечвае рэгулярную і своечасовую дастаўку газеты.

ЦСПСБ і фінсекцыя горсовета прапануюць
усім вылучаным таварышам для праверкі правільнасці налічэння падаходнага падатку і культзбору заканчваць праверку і прадстаўленне актаў у гарфа
не пазней 20 га снежня.
Фабзаўмясцкомам праверыць выкананне ў вызначаны тэрмін.
ЦСПСБ Фінсекцыя.

МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ БЕЛДЗЯРЖТРАНСА
з 5 снежня г.г. ПРЫСТУПІЛА ДА ЗАКЛЮЧЭННЯ ДАГАВАРОЎ НА АЎТАГУЖАВЫЯ ПЕРАВОЗКІ І ТРАКСПАРТНА-ЭКСПЕДЫЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ.
ПРОСЬБА да ўсіх зацікаўленых прадпрыемстваў і ўстаноў
ЗАКЛЮЧЫЦЬ ДАГАВОРЫ ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1935 Г.,
пасля якога заключэнне дагавораў будзе спынена.
Адрас: Маскоўская, 3, 1 п верх, пакой 8

20 снежня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра (вул. Валадарскага, 7) адбудзецца
ПЕРШЫ АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПЛЕНУМ
новавыбранага Менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў XIV склікання
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі выбараў і далейшыя задачы работы Менгорсовета.
2. Выбары: а) прэзідыума горсовета,
б) старшыні і сакратара горсовета,
в) мандатнай камісіі.
3. Выбары на Усебеларускі з'езд советаў.
На пленум па сваіх мандатах уваходзяць: члены і кандыдаты горсовета, члены ЦК КП(б)Б і БК ЛКМБ, члены ЦВК і СНК БССР, упаўнаважаныя КПК і КСК, члены бюро гаркома КП(б)Б і гаркома ЛКСМБ, члены прэзідыума ЦСПСБ
Запрашаюцца дэпутаты мінулага складу горсовета і ўдарнікі прадпрыемстваў і ўстаноў.
Білеты атрымаць у Горсовеце, 38 пакой 3 паверх) 19 і 20 снежня.
Прэзідыум Менгорсовета.

СЁННЯ, 17-га снежня, у 6 гадзін вечара, у пом шканні клуба харчэвікоў імя Сталіна адбудзецца
ЗАКЛЮЧНАЕ ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ
усебеларускага камітэта па агляду харчовых прадпрыемстваў
сумесна з гарадской фабрычна-заводскім камісіямі пры ўдзеле шырокага актыва прадпрыемстваў.
УСЕБЕЛАРУСКІ АГЛЯДАВЫ КАМІТЭТ.

ДА ЎВАГІ КАЛГАСАЎ, О СА'Ў і іншых гаспадарчых арганізацый
Беларуская канторы па загатоўцы плем. жывёлы
„ПЛЕМЗАГОТКАНТОРА" НКЗ СССР
даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых арганізацый, што яна праводзіць куплю і продаж племяннай і высокапрадуктыўнай жывёлы: быкоў, кароў, маладняка буйнай рагатай жывёлы, свіней і авечак па канкурэнтаздольных цэнах, зацверджаных Комзат СНК СССР.
Адначасова з прыёмкай закупкай ПЗК кантрактуе племянны маладняк буйную рагатую жывёлу і свіней у калгасах, калгаспікаў, гарадскога насельніцтва і адзіноасобніку з вялікай кампэнсацыяй; гавыя кармоў і грашовых авансаў, Наркаматы, вайсковы-гаспадарчыя ўстановы, ОРСы, саўгасы, калгасы, і інш. арганізацыі, рабочыя, бескароўныя калгаснікі і адзіноасобныя, жадаючыя набыць у 1 35 г. племянную і высокапрадуктыўную жывёлу, павінны падаць заяўкі і заключыць дагаворы да 1 студзеня для ўключэння ў план 1935 г. Несвоечасовасць падачы дакументаў з указаннем віду жывёлы, пароды, полу, узросту і інш. канцэсый, не дае магчымасці атрымання жывёлы ў планавым парадку ў 1935 г.
Жывёла прадаецца ўпаўне здаровая, пракармленая ў якасных вынасінах і пазбаўленая ўсякіх фізічных недахопаў, перашкаджаючых племяннай і прадуктыўнай дзейнасці. Якасць прадаваемай жывёлы строга адпавядае кандыцыям, абумоўленым дагаворам.
Адрас Беллдзярготкантора: г. Менск, Дом урада, 1 паверх, тэл. 22-703
Цэнтральная база Менск, Раз ноская 110, тэл. 20-359
Віцебская база, Віцебск, Ветэрынарная, 32, тэл. 44 (пад'езд)
Жлобінская база ПЗК: Совецкая 16. ДЫРЭКЦЫЯ

Абавязковая пастанова №28
Менскага гарадскога совета і оргбюро Менскага раённага выканаўчага камітэта
13 снежня 1934 г. г. Менск.
„Аб забоі і клеймаванні жывёлы,,
У мэтах паляпшэння паступлення на рынак высокакласнага мяса, Менскі гарадскі совет і оргбюро Менскага райвыканкома ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:
1. Абавязаць усе дзяржаўныя, камерцыйныя арганізацыі, вайсковыя часці і ўсіх грамадзян забіваць жывёлу як для прамысловых, гандлёвых мэт, так і для асабістага спажывання выключна на Менскім мясакамбінаце.
2. Мяса забітай жывёлы па-за Менскам як на бойні, так і не ў бойні і дастаўленае ў Менск павінна быць абавязкова перакліймавана на мясакантрольных станцыях.
Усе ўстановы, арганізацыі і прыватныя асобы, дастаўляючыя палавыя тушы мяса на мясакантрольныя станцыі, абавязаны побач з тушай прадстаўляць для ветагляду лёгкія, сэрца і печань ад усякага віду жывёлы, ад свіней і авец — аслабаны ад садзяржымага і шпічнік, ад цялят — страўнік.
4. Ветперсанал без прадпісання і агляду вышэй паказаных унутраных часцей жывёлы не мае права кляймінь.
УВАГА: Гэты парадак не пашыраецца ў тых выпадках, калі мяса прадстаўляецца на мясакантрольныя пункты не цэлымі тушамі, а часткамі.
5. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на міліцыю, мясазагатоўчыя арганізацыі і вет нагляд.
6. Вінаватыя ў парушэнні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу да 100 руб., або прымусовых работ да 15 дзён.
7. Гэта пастанова ўваходзіць у сілу з часу яе апублікавання.
Старшыня Менскага горсовета ЖУКОВІЧ.
Старшыня оргбюро РВК ТУРЭЦКІ.
Сакратар Менгорсовета ІПАТАЎ.

ПАРТВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
ВЫШАЎ З ДРУКУ і разаслан на месцы
БЛОК-НОТ АГІТАТАРА № 3
аб перабудове прафсаюзаў і калдагаворнай кампаніі.
Тыр. 8.000. Цана 30 кап.
Патрабуйце ва ўсіх кнігарнях ДВБ, БАКТа і ў магазіне Партвыдавецтва (Совецкая 61).

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. рэдактар — БЯРОЗАВІК ст. метранпаж — ПЕРАКЛАДНЁЎ, ст. стэрэатыпёр—ПЕДЗІК, ст. друкар АН УЧЫН. Тыраж 87.000 Уп. Галоўлітбела № 6325.